А. К. Усціновіч

Слоўнік асабовых уласных імён

Б В

А. К. Усціновіч

Слоўнік асабовых уласных імён



Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2011

УДК 811.161.3'373.231'374
ББК 81.2Беи-4
У80

Навуковы рэдактар
член-карэспандэнт НАН Беларусі,
доктар філалагічных навук *А. А. Лукашанец*

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук, прафесар *Г. М. Мезенка*;
кандыдат філалагічных навук *І. І. Лучыц-Федарэц*

Усціновіч, А. К.
У80 Слоўнік асабовых уласных імён / А. К. Усціновіч ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 240 с.
ISBN 978-985-6941-10-1.

Слоўнік з'яўляецца найбольш поўным нарматыўным даведнікам па выкарыстанні ўласных асабовых беларускіх імён, утварэнні імён па бацьку. Прыведзены розныя па паходжанні мужчынскія і жаночыя імёны, у тым ліку рэдкаўжывальныя і ўстарэлыя; пададзены найбольш пашыраныя іх народныя, размоўныя і вытворныя формы і варыянты. Выданне ўтрымлівае таксама інфармацыю аб іншамоўных адпаведніках беларускіх імён.

Адрасуецца работнікам пашпартных сталоў і кадравых службаў, ЗАГСаў, натарыяльных кантор і юрыдычных кансультацый, работнікам друку, настаўнікам і студэнтам, а таксама ўсім тым, хто цікавіцца сучасным беларускім іменасловам.

УДК 811.161.3'373.231'374
ББК 81.2Беи-4

ISBN 978-985-6941-10-1

© Усціновіч А. К., 2011
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2011

ПРАДМОВА

Уласныя імёны складаюць вельмі важную і разам з тым вельмі спецыфічную частку слоўнікавага складу любой мовы, у тым ліку і беларускай. Асабовыя ўласныя імёны ўваходзяць у нацыянальны лексікон беларускай мовы як састаўная частка, аднак істотна адрозніваюцца ад агульных найменняў як па сваім складзе і асаблівасцях гістарычнага фарміравання, так і па сваёй функцыянальнай ролі.

Уласныя асабовыя імёны разам з імем па бацьку і прозвішчам з'яўляюцца найважнейшым сродкам ідэнтыфікацыі чалавека. Кожны жыхар нашай краіны, як і кожны чалавек наогул, атрымлівае ўласнае імя адразу пасля нараджэння, яно суправаджае яго на працягу ўсяго жыцця. Выбранае імя запісваецца ў дакументах, што сведчаць асобу: пасведчанні аб нараджэнні, пашпарце, дакументах аб адукацыі, у пасведчанні аб заключэнні шлюбу і г. д. Уласнае імя перадаецца ў спадчыну дзецям, паколькі ў пасведчанні аб нараджэнні абавязкова ўказваюцца імёны бацькі і маці. Імя бацькі перадаецца асобе і ў выглядзе імя па бацьку, якое разам з уласным іменем і прозвішчам выступае абавязковай часткай сучаснай трохкампанентнай формулы афіцыйнага наймення асобы.

Сказанае сведчыць, што ўласныя асабовыя імёны выконваюць спецыфічную функцыю ідэнтыфікацыі асобы. У сучасным ужыванні яны не выражаюць ніякага сэнсавага значэння, а толькі ўказваюць на асобу, выдзяляюць яе з кола іншых, хаця гістарычна многія ўласныя імёны суадносяцца з агульнаўжывальнымі словамі з пэўным лексічным значэннем. Менавіта асабовае ўласнае імя ў сукупнасці з прозвішчам і імем па бацьку дазваляе ідэнтыфікаваць асобу з усяго калектыву, людской супольнасці ў цэлым. Таму выкарыстанне і функцыянаванне ўласных імён з'яўляецца не толькі асабістай справай носьбіта таго ці іншага імені, але і ўсяго грамадства. Дзякуючы ўласнаму імені асоба не толькі становіцца паўнавартасным членам калектыву, але і пакідае свой след у гісторыі. Увогуле, сёння цяжка сабе ўявіць функцыянаванне грамадства і яго інстытутаў без уласных імён і прозвішчаў. Таму вельмі важна і неабходна ведаць асаблівасці свайго нацыянальнага іменніка, асаблівасці яго функцыянавання.

Вывучэннем сістэмы ўласных імён, у тым ліку і асабовых, займаецца асобны раздзел анамастыкі – антрапаніміка, якая не толькі фіксуе і сістэматызуе наяўны інвентар гэтых моўных сродкаў ідэнтыфікацыі асобы, але і вывучае гісторыю фарміравання нацыянальных антрапанімічных сістэм. Сістэма сучасных беларускіх асабовых імён фарміравалася на працягу доўгага гістарычнага перыяду і ўяўляе

дастаткова складанае адзінства, якое аб'ядноўвае вельмі розныя па сваім паходжанні пласты і групы іменалагічнай лексікі, якія спецыфічна функцыянуюць і ўзаемадзейнічаюць паміж сабой.

Аснову сучаснага беларускага іменаслова складаюць хрысціянскія імёны, якія аб'ядноўваюць спрадвечныя ўласныя асабовыя імёны, што склаліся на ўласным беларускім і ўсходнеславянскім моўным матэрыяле (*Уладзімір*, *Вячаслаў*, *Яраслаў* і інш.), а таксама імёны старажытнаяўрэйскага (*Іван*, *Сямён*, *Міхаіл*, *Ганна*, *Марыя* і інш.), грэчаскага (*Георгій*, *Андрэй*, *Аляксандр*, *Несцер*, *Платон*, *Фёдар*, *Алімпіяда*, *Ксенія*, *Софія*, *Агата*, *Пётр*, *Максім* і інш.), лацінскага (*Валерый*, *Марк*, *Валянцін*, *Агрыпіна*, *Клаўдзія* і інш.) паходжання. У сучасным беларускім антрапаніміконе трывала замацаваліся і ўспрымаюцца як уласныя многія імёны, што прыйшлі з моў іншых народаў, з якімі кантактавалі нашы продкі, напрыклад, *Вітаўт*, *Альгерд*, *Алег*, *Глеб*, *Ігар*, *Вольга*, *Тамара*, *Ніна*, *Рагнеда* і інш.

Сучасны корпус беларускага іменаслова ўключае імёны, што прыйшлі з іншых еўрапейскіх моў, тыпу *Арнольд*, *Артур*, *Жанна*, *Віялета*, *Элеанора*. Іх пашырэнню спрыялі папулярныя творы мастацкай літаратуры, радыё і тэлебачанне, кіно. Як самастойныя імёны функцыянуюць зараз многія пашыраныя ў сучасных еўрапейскіх мовах скарочаныя, памяншальныя і ласкальныя формы, тыпу *Ада*, *Аніта*, *Эрна*, *Рыта*.

Асобную групу сучаснага беларускага іменаслова складаюць так званыя новыя рэвалюцыйныя імёны, што з'явіліся ў 20-я гг. XX ст., як моўнае адлюстраванне грамадска-палітычных рэалій таго часу. Да такіх імён адносяцца *Ідэя*, *Інтэрна*, *Трактарына*, *Воля*, *Свабода*, *Слава*, *Кім*, *Іскра*, *Уладзілен*, *Марлен* і інш. Такія імёны не толькі да гэтага часу сустракаюцца ў творах мастацкай і іншай літаратуры, але іх носьбітамі з'яўляюцца грамадзяне нашай краіны.

Найбольш пашыраныя і ўжывальныя ў наш час імёны, якія адносяцца да сістэмы традыцыйных хрысціянскіх імён, а таксама імёны, якія звязаны з гісторыяй і культурай беларускага народа (*Вітаўт*, *Альгерд*, *Рагнеда* і інш.). Асаблівасцю функцыянавання хрысціянскай па паходжанні часткі сучаснага беларускага іменніка з'яўляецца і тое, што ў ім паралельна ў якасці афіцыйных (дакументальных) ужываюцца тры самастойныя падсістэмы: візантыйска-праваслаўная (найбольш набліжаная да рускай іменаслоўнай традыцыі), рымска-каталіцкая (у значнай ступені суадносная з польскай мовай) і ўласная народная (найбольш нацыянальна адметная). Частка гэтых паралельных радоў імён поўнасцю супадае па гукавым складзе (*Адам*, *Раман*, *Пётр* і інш.), а другая – мае неаднолькавае фанетычнае афармленне. Параўнайце, напрыклад, рады візантыйска-праваслаўных і рымска-каталіцкіх імён: *Фёкла* і *Тэкля*, *Фама* і *Тамаш*, *Іван* і *Ян*, *Іосіф* і *Юзаф*. Побач з традыцыйнымі формамі праваслаўных імён *Васілій*, *Генадзій*, *Анатолій*, *Пракопій*, *Якаў*, *Іосіф* ужываюцца народныя *Васіль*, *Генадзь*, *Анатоль*, *Пракоп*, *Якуб*, *Язэп* і інш.

На функцыянаванне ў вуснай і пісьмовай практыцы ўласных асабовых імён істотны ўплыў аказвае моўная сітуацыя, а таксама разнастайныя пазалінгвістычныя фактары. Так, вельмі істотным фактарам для сучаснай беларускай іменаслоўнай практыкі з'яўляецца дзяржаўнае беларуска-рускае двухмоўе, у выніку чаго найбольш важныя

дакументы, якія сведчаць асобу, афармляюцца на абедзвюх дзяржаўных мовах, што стварае праблему перадачы ўласных асабовых імён і міжмоўнай адпаведнасці імён, а таксама пэўныя цяжкасці пры афармленні таго ці іншага імені графічнымі сродкамі іншай мовы. Яшчэ адной істотнай праблемай пісьмовага функцыянавання беларускага антрапанімікону з'яўляецца неабходнасць перадачы асабовых імён сродкамі лацінскага алфавіта.

Уласныя імёны ў залежнасці ад сітуацыі маўлення выступаюць у разнастайных формах і варыянтах. Поруч з поўнымі дакументальнымі формамі існуюць размоўна-бытавыя (скарочаныя, дэмінутыўныя, гіпакарыстычныя) іх варыянты. Але здольнасць імён да вар'іравання не заўсёды бярэцца пад увагу пры афармленні дакументаў, што выклікае рад непажаданых з'яў. Замест поўных форм імён у дакументах часта фіксуюцца размоўна-гутарковыя варыянты, замест прынятых дакументальных форм уносяцца дыялектныя, пашыраныя на пэўнай тэрыторыі, у дакументах адной і той жа асобы сустракаюцца розныя варыянты аднаго і таго ж імя або праваслаўнае імя замяняецца адпаведным імем каталіцкім і наадварот, непаслядоўна ўтвараюцца імёны па бацьку ад розных варыянтаў аднаго і таго ж мужчынскага імені.

Таму важнейшай задачай Слоўніка з'яўляецца, па магчымасці, поўнае адлюстраванне асабовых імён, якія засведчаны ў Беларусі. Гэтай мэце падпарадкавана і структура слоўнікавага артыкула, які ўключае наступныя элементы:

• загалоўнае слова – афіцыйную (дакументальную) форму асабовага імя (і яго прынятую лацінамоўную транслітарыраваную форму);

• граматычную характарыстыку (імя мужчынскае – м., жаночае – ж.);

• стылістычную і часавую характарыстыку (слав., ст. рэдк.);

• формы імя па бацьку;

• вытворныя формы імя і пашыраныя на тэрыторыі Беларусі прозвішчы, што ўтварыліся ад гэтага імя;

• агульнамоўныя формы дадзенага імя ў сучасных еўрапейскіх мовах;

• дзень імянін на падставе традыцыйных календароў, апрацаваных царквой і касцёлам;

• звесткі пра паходжанне імя і яго першапачатковае значэнне.

Напрыклад:

АЛЯКСА́НДР (Aliaksandr) -а, *м.* Аляксáндравіч, Аляксáндраўна.

Вядома з XIV ст. як Александр (1528), Александро (1525), Александер (1388), Олександр (1465), Олександро (1540), Александор (1682), Олехно (1528), Алес (1746), Олех (1528), Санко (1555), Санько (1555), Санюк (1555), Санец (1540), Санюта (1541).

Вытворныя: Алéсь, Аляксáнка, Алéсік, Алéська, Аляскю́к, Аляхнó, Áлік, Алькó, Лесь, Лéсік, Лéська, Ляськó, Ляскю́к, Сан, Сáнік, Санюк, Санчýк, Санюта, Сáша, Сашкó, Сáшанька, Сашýня, Сашýта, Сашýра, Шýра, Шýрка, Шýрык, Аля, Лёкса.

Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Аляксáндраў, Александрóвіч, Аляксáнкін, Алéсь, Алéсіч, Алéсенка, Алéсік, Алéська, Аляскю́к, Аляхнó, Аляхнóвіч, Алікéвіч, Алькóвіч, Лесь, Лéсін, Лéсік, Лéська, Ліксáндра, Ляськó, Ляскю́к, Сáнаў, Сáнін, Санéц, Санцэ́віч, Сáнька,

Санько́, Санко́віч, Санке́віч, Санікéвіч, Санюк, Санюко́віч, Санчу́к, Санюта, Сашано́к, Сашко́, Са́шчанка, Са́шанькін.

Англ. *Alexander*, балг. *Александър, Алека, Алеко, Алек, Алекс, Леко, Лего, Сашо, Сандро,* венг. *Sándor, Alex*, ісп. *Alejandro*, іт. *Alessandro,* літ. *Aleksandras, Aleksas,* ням. *Alexander*, польск. *Aleksander,* руск. *Алекса́ндр,* славац. *Aleksander*, славен. *Alexandr, Alex*, укр. *Олекса́ндр, Оле́сь, Лесь,* франц. *Alexandre,* чэш. *Alexandr.*

[Грэч. *Alexandros: alexō* – абараняць і *anēr, andros* – муж, мужчына]

Імяніны: 15 I, 26, 27 II, 18, 20 III, 24 IV, 3, 8 V, 10 VII, 11, 28 VIII, 11 XI, 12 XII.

КАЦЯРЫ́НА (Katsiaryna) -ы, *ж.*

Вядома з XVI ст. як Катерина (1555), Катрина (1540), Катарина (1625), Катериница (1540), Касюта (1541), Касютка (1556).

Вытворныя: Кацярына́, Кацярына́чка, Ка́тра, Катру́ня, Катру́нька, Катру́ся, Катру́ська, Ка́ця, Ка́цечка, Кацю́ша, Ка́ся, Ка́ська, Ка́сечка, Касю́ля.

Англ. *Catherine, Catharine, Katharine,* балг. *Катерина, Екатерина, Катка, Катя, Катина, Кина, Кинка,* венг. *Katalin, Kata, Kató, Katinka,* ісп. *Catalina,* іт. *Caterina, Rina,* літ. *Kotryna, Katryna, Katrynė, Katarina, Katrė,* ням. *Katharina, Katharine,* польск. *Katarzyna,* руск. *Екатери́на, Катери́на,* укр. *Катери́на, Ка́тря,* славац. *Katarina,* славен. *Katarina, Katja, Katka,* франц. *Katherine,* чэш. *Kateřina, Katrin, Katrina.*

[Грэч. *Haikaterinē*<*katharon* – чысціня, прыстойнасць]

Імяніны: 24 XI.

Безумоўна, у розных слоўнікавых артыкулах у залежнасці ад пашыранасці таго ці іншага асабовага імя названыя структурныя элементы прадстаўлены з рознай паўнатой.

Імёны пададзены ў алфавітным парадку, запісаны ў адпаведнасці з сучаснымі правапіснымі нормамі беларускай мовы і па традыцыі ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку. У якасці абавязковай граматычнай формы прыводзіцца канчатак роднага склону. Перавага аддаецца пашыранай форме і даецца ўся яе характарыстыка, а традыцыйная – прыводзіцца на сваім месцы ў алфавітным парадку са спасылкай на першую. Паралельныя формы імені, якія могуць выкарыстоўвацца ў якасці дакументальных, таксама прыводзяцца ў асноўным слоўнікавым артыкуле.

У якасці асноўных крыніц абраны гісторыка-юрыдычныя дакументы XVI–XVIII: акты земскіх судоў, матэрыялы падкаморскіх і павятовых судоў, дакументы эканоміі, сістэматызаваныя і выдадзеныя Віленскай археаграфічнай камісіяй у шматлікіх тамах (Вільна, 1865, 1867, 1870, 1871, 1872, 1874, 1888, 1890, 1894 г. в.).

А. А. ЛУКАШАНЕЦ,
член-карэспандэнт НАН Беларусі,
доктар філалагічных навук,
дырэктар Інстытута мовы
і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Скарачэнні

англ. – англійскае
арабск. – арабскае
арам. – арамейскае
асір. – асірыйскае
балг. – балгарскае
баск. – баскскае
венг. – венгерскае
гальск. – гальскае
гебр. – гебрэйскае
герм. – германскае
груз. – грузінскае
грэч. – грэчаскае
дыял. – дыялектнае
егіп. – егіпецкае
ж. – жаночы род
запаз. – запазычанае
і. – імя
ісп. – іспанскае
іт. – італьянскае
кельцк. – кельцкае
ласк. – ласкальнае
лац. – лацінскае
літ. – літоўскае
м. – мужчынскі род
мн. – множны лік
наз. – назоўнік
нов. – новае
ням. – нямецкае
памянш. – памяншальнае
перан. – пераноснае значэнне
перс. – персідскае
польск. – польскае
прым. – прыметнік
разм. – размоўнае
руск. – рускае
рэдк. – рэдкае
санскр. – санскрытскае
сербск. – сербскае
серыйск. – серыйскае
сканд. – скандынаўскае
скар. – скарочанае
слав. – славянскае
славац. – славацкае
славен. – славенскае
ст.-англ. – старажытнаанглійскае
ст.-верх.-ням. – старажытнаверхненямецкае
ст.-герм. – старажытнагерманскае
ст.-грэч. – старажытнагрэчаскае
ст.-ірл. – старажытнаірландскае
ст.-ням. – старажытнанямецкае
ст.-перс. – старажытнаперсідскае
ст.-руск. – старажытнарускае
ст.-рымск. – старажытнарымскае
ст. рэдк. – старое, рэдкае
ст.-сканд. – старажытнаскандынаўскае
ст.-слав. – старажытнаславянскае
ст.-фрак. – старажытнафракійскае
ст.-яўр. – старажытнаяўрэйскае
тат. – татарскае
трад. – традыцыйнае
укр. – украінскае
франц. – французскае
халдз. – халдзейскае
цюрк. – цюркскае
чэш. – чэшскае
швед. – шведскае

Выкарыстаныя крыніцы

Асноўныя

1. Балканская этимология: Болгария [Электронный ресурс]. – 2010. – Режим доступа: http://balkany.net/kultura/balkanskaya-etimologiya.html. – Дата доступа: 05.05.2010.

2. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 328 с.

3. Бондалетов, В. Д. Русская ономастика / В. Д. Бондалетов. – М. : Просвещение, 1983. – 223 с.

4. Българските имена [Электронный ресурс]. – 2010. – Режим доступа: http://www.imenata.com. – Дата доступа: 05.05.2010.

5. Бялькевіч, І. К. Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны / І. К. Бялькевіч. – Мінск : Навука і тэхніка. – 1970. – 510 с.

6. Гиляревский, Р. С. Иностранные имена и названия в русском тексте : справочник / Р. С. Гиляревский, Б. А. Старостин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Международные отношения, 1978. – 240 с.

7. Делерт, Д. Новые имена / Д. Делерт. – «Советский Юг», 1924.

8. Европейские имена: Значение и происхождение. Болгарские имена [Электронный ресурс]. – 2010. – Режим доступа: http://kurufin.narod.ru/bulgarian.html. – Дата доступа: 05.05.2010.

9. Етимологічний словник української мови : в 7 т. – Київ : Наукова думка, 1983.

10. Илчев, С. Речник на личните и фамилни имена у българите / С. Илчев. – София, 1969. – 218 с.

11. Казаков, В. С. Именослов: Словарь славянских имен и прозвищ с толкованием их значения и происхождения / В. С. Казаков. – Калуга, 1997.

12. Левченко, С. П. Словник власних імен людей (українсько-російський і російсько-український) / С. П. Левченко, Л. Г. Скрипник, Н. П. Дзятківська. – 4-е выд., випр. і доп. – Київ : Наукова думка, 1973. – 278 с.

13. Носович, И. И. Словарь белорусского наречия / И. И. Носович. – СПб : Типографія Императорской академіи наукъ, 1870. – 778 с.

14. Петровский, Н. А. Словарь русских личных имен / Н. А. Петровский. – М. : АСТ, 2006. – 480 с.

15. Рыбакин, А. И. Словарь английских личных имен. 3000 имен / А. И. Рыбакин. – М. : Сов. Энциклопедия, 1973. – 408 с.

16. Скрипник, Л. Г. Власні имена людей : словник-довідник / Л. Г. Скрипник, Н. П. Дзятківська. – Київ : Наукова думка, 1986. – 308 с.

17. Словарь английских личных имен. – М. : Русский язык, 1989. – 221 с.

18. Слоўнік асабовых уласных імён / уклад. М. Р Суднік; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 176 с.

19. Справочник личных имен народов РСФСР. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Русский язык, 1979. – 574 с.
20. Суперанская, А. В. Справочник личных имен народов РСФСР / А. В. Суперанская, Ю. М. Гусев. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Наука, 1987. – 570 с.
21. Суперанская, А. В. Структура имени собственного (фонология и морфология) / А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1969. – 208 с.
22. Тихонов, А. Н. Словарь русских личных имен / А. Н. Тихонов, Л. З. Бояринова, А. Г. Рыжкова. – М., 1995.
23. Труевцева, О. Н. Английский язык: особенности номинации / О. Н. Труевцева. – Л. : Наука, 1986. – 247 с.
24. Усціновіч, А. К. Антрапанімія Гродзеншчыны і Брэстчыны (XIV–XVIII стст.) / А. К. Усціновіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 175 с.
25. Bach, A. Die deutschen Personennamen / A. Bach. – Heidelberg, 1952. – T. 1–2.
26. Bubak, J. Księga naszych imion / J. Bubak. – Wrocław. Warszawa. Kraków, 1993.
27. Karplukówna, M. Polskie imiona słowiańskie / M. Karplukówna. – Wrocław, 1973.
28. Kovaczev, N. Czestotno-tъlkoven recznik na licnznite imena u Bъlgarite / N. Kovaczev. – Sofia, 1987.
29. Księga imion / B. Kupis, B. Wernichowska, J. Kamyczek, Ł. Kern. – 1975.
30. Šimundić, M. Rječnik osobnin imena / M. Šimundić. – Zagreb, 1988.
31. Słownik imion / Opracowały W. Janowowa, A. Skarbek, B. Zbijowska, J. Zbiniowska. – Wrocław. Warszawa. Kraków. Gdańsk, 1975.

У якасці дадатковых крыніц выкарыстаны рукапісныя даведнікі і асабістыя запісы:

1. Мядзведскі, С. Беларускі слоўнік / С. Мядзведскі. – 1910 (рукапіс).
2. Носович, И. И. Алфавитный указатель слов, извлеченных из актов, относящихся к истории Западной России / И. И. Носович (рукопись).
3. Слоўнічак уласных іменняў, якаія ўжываюцца ў Кастюковіцкім р-не Калінінскае акругі // сабраў старшыня Касцюковіцкага раёна краязнаўчага т-ва Т. Мікалаеў.
4. Шашалевіч, А. Краснапольскі раён. Калінінская акруга (в. Палуж, Маластоўка, Хвёдараўка, б. Хутары, Горкі) / А. Шашалевіч.
5. Шпілеўскі, П. Рукапісны слоўнік / П. Шпілеўскі. – 1853 г.
6. Ярушэвіч, А. В. Расейска-беларускі слоўнік. 1914 (рукапіс № 2) // Бібліятэка Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР. – Я78.

У слоўніку таксама выкарыстаны асабістыя матэрыялы і запісы аўтара.

А

ААРО́Н (Aaron) -а, *м.* Ааро́навіч, Ааро́наўна.
Вядома з XV ст. як Аарон (1416), Арон (1420), Аронка (1560), Арончук (1612).
Вытворныя: Ааро́нка, Аро́нка, Ро́ня.
Англ., ням. *Aaron, Aron,* балг. *Арон,* венг. *Áron,* ісп. *Aaron,* іт. *Aronne,* літ. *Aronas,* польск., славен., франц. *Aron,* руск. *Ааро́н, Аро́н,* укр. *Ааро́н,* чэш. *Árón, Áron.*
[Ст.-яўр. імя *Ahārōn<ārōn* – скрынка, каўчэг запавету]
Імяніны: 13 V, 1 VII, 9 X.

АБАГО́Р (Abahor) -а, *м.* Абаго́равіч, Абаго́раўна. Ст. рэдк.
Руск. *Абаго́р,* укр. *Абаго́р.*

АБАКУ́М (Abakum) -а, *м.* Абаку́мавіч, Абаку́маўна.
Гл. Авакум.
Вядома з XVI ст. як Абакум (1578), Обакун (1577), Обакум (1580), Бакун (1541).
Вытворныя: Абаку́нчык, Бакун, Бо́кун, Баку́нчык.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Абаку́маў, Абаку́нчык, Баку́н, Бо́кун, Баку́нчык, Бакуно́віч.
Англ. *Habakkuk,* руск. *Абаку́м,* укр. *Абаку́м.*
[Ст.-яўр. імя *Hābaqqūq* – абнімі (Божа) *<hābaq* – абдымаць]
Імяніны: 6 VII, 2 XII.

АБАМО́Н (Abamon) -а, *м.* Абамо́навіч, Абамо́наўна. Ст. рэдк.
Руск. *Абамо́н,* укр. *Абамо́н.*

АБДАІ́КЛ (Abdaikl) -а, *м.* Абдаіклавіч, Абдаіклаўна. Ст. рэдк.
Руск. *Абдаи́кл,* укр. *Абдаі́кл.*
[Арабск. ці перс.]

АБДО́Н (Abdon) -а, *м.* Абдо́навіч, Абдо́наўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Абдо́ня, Абдо́ша, До́ня.
Англ., ням., польск., славац., франц. *Abdon,* балг. *Абдон, Авдон,* венг. *Abdon, Abdone,* ісп. *Abdon, Abdo,* літ. *Abdonas,* руск. *Авдо́н, Абдо́н,* укр. *Абдо́н,* чэш. *Abdon, Abadon.*
[Ст.-яўр. імя *'abdōn* – слуга, раб]
Імяніны: 30 VII.

А́БЕЛЬ (Abel) -я, *м.* А́белевіч, А́белеўна. Ст. рэдк.
Гл. А́вель.
Англ., венг., ісп., іт., ням., польск., славен., франц., чэш. *Abel,* балг. *Авел,* літ. *Abelis, Awel,* руск. *А́бель,* укр. *А́вель.*
[Ст.-яўр. імя *hebel* – лёгкі павеў]
Імяніны: 2 I, 2 VI, 5 VIII, 5, 9 XII.

АБРА́М (Abram) -а, *м.* Абра́мавіч, Абра́маўна.
Гл. Аўраам.
Вядома з XVI ст. як Абрам (1528), Абраам (1657), Абрагам (1681), Обрамец (1539).
Вытворныя: Абра́мец, Абра́мка, Абра́мчык, Абрамўк, Абрамчўк.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Абра́маў, Абрамо́віч, Абра́менка, Абраме́ня, Абра́мцаў, Абра́мчанка, Абра́мчык, Абрамўк, Абрамчўк.
Англ., ням., польск., славац., франц., чэш. *Abraham,* балг. *Авpам, Авраам,* венг. *Ábrahám,* ісп. *Abrahán, Abraham,* іт. *Abramo,* літ. *Abraomas, Abrahamas, Abromas,* руск. *Авраа́м, Авра́м, Авраа́мий, Абра́м,* укр. *Авра́м, Овра́м, Абра́м, Абраа́м.*
[Ст.-яўр. імя *Abrām* – бацька народаў]
Імяніны: 14 II, 16 III, 15 VI, 16 VIII, 9 X, 6 XII.

АВАДО́Н (Avadon) -а, *м.* Авадо́навіч, Авадо́наўна. Ст. рэдк.
Гл. Аўдо́н.
Вытворныя: Авадо́ня, Авадо́ша, До́ня.
Руск. *Авадо́н,* укр. *Авадо́н.*

АВАКІ́Р (Avakir) -а, *м.* Авакі́равіч, Авакі́раўна. Ст. рэдк.

Вытворныя: Кіра, Ава.
Руск. *Аввакýр*, укр. *Авакíр.*

АВАКУ́М (Avakum) -а, *м.* Авакýмавіч, Авакýмаўна.
Гл. Абакýм.
Вядома з XVI ст. як Авакум (1567).
Вытворныя: Авакýшка, Авакýмчык, Авакýмачка.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Авакýмаў, Авакýменка.
Англ. *Habakkuk*, руск. *Аввакýм*, укр. *Авакýм.*
[Ст.-яўр. імя *Hāḇaqqūq<hābaq* – абдымаць]
Імяніны: 6 VII, 2 XII.

А́ВЕЛЬ (Avel) -я, *м.* Áвелевіч, Áвелеўна. Ст. рэдк.
Гл. Áбель.
Вытворныя: Авéля, Вéля, Áва.
Балг. *Авел*, руск. *Áвель*, укр. *Áвель.*
[Ст.-яўр. *hęḇeḷ* – лёгкі павеў]
Імяніны: 2 I, 2 VI, 5 VIII, 5, 9 XII.

АВЕ́РКІЙ (Averki) -я, *м.* Авéркіевіч, Авéркіеўна.
Вядома з XVI ст. як Аверкей (1558), Оверкей (1541), Оверкій (1555), Аверко (1577), Оверко (1540), Оверке (1528), Оверян (1567).
Вытворныя: Авéрка, Авяр'я́н, Авéр, Авéра.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Авяркóў, Авéркін, Авéрчанка, Авяр'я́наў, Авéр, Авéрын, Авéркаў.
Руск. *Авéркий*, укр. *Авéркій, Овéркій.*
[Лац. *averto* – утрымліваць]
Імяніны: 26 V, 22 X.

АВІ́ВА (Aviva) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Авíў. Ст. рэдк.
Вытворныя: Авíўка, Вíва.
Руск. *Авúва*, укр. *Авíва.*

АВІГЕ́Я (Aviheya) -і, *ж.*
Англ. *Abigail*, руск. *Авигéя*, укр. *Авігéя.*
[Ст.-яўр. *'ăḇīgayil* – бацька мой, мая радасць]

АВІ́Д (Avid) -а, *м.* Авíдавіч, Авíдаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Авíдка.
Руск. *Авúд*, укр. *Авúд.*
[Арам. *'aḇidā* – работа]

АВІ́ДЗІЙ (Avidzi) -я, *м.* Авíдзіевіч, Авíдзіеўна.
Венг. *Ovidiusz*, ісп., іт. *Ovidio*, літ. *Ovidijus*, ням. *Ovid*, польск. *Owidiusz*, руск. *Овúдий*, славац., чэш. *Ovidius*, укр. *Овíдій*, франц. *Ovide.*
[Лац. *ovis* – авечка]
Імяніны: 6 V.

АВІ́М (Avim) -а, *м.* Авíмавіч, Авíмаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Авíмка, Вíма, Áва.
Руск. *Авúм*, укр. *Авúм.*
[Грэч. *aētа* – подых, павеў]

АВІСАЛО́Н (Avisalon) -а, *м.* Авісалóнавіч, Авісалóнаўна.
Вядома з XIII ст. у Польшчы як *Absalon* (1257), *Absolon* (1349).
Англ. *Absalom*, венг. *Absa, Absolom*, ісп., славен., франц. *Absalon*, іт. *Assalonne*, літ. *Absalomas*, ням. *Absalom, Axel*, руск. *Ависолóн*, славац. *Absolón*, укр. *Авісолóн*, чэш. *Absolón.*
[Ст.-яўр. імя *'Aḇšālōm* – бацька спакою, святла]
Імяніны: 2 IX.

АВІ́Ў (Aviu) -ва, *м.* Авíвавіч, Авíваўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Авíва, Вíва.
Руск. *Авúв*, укр. *Авúв.*
[Ст.-яўр. *'aḇīḇ* – час года, калі паспяваюць каласы]

АВІ́Я (Aviya) -і, *ж.*
Вытворныя: Áва, Вíя.
Руск. *Авúя*, укр. *Авíя.*
[Ст.-яўр. імя *'Aḇīyā* – Яхве (Бог) – мой бацька]

АВІЯ́ТА (Aviyata) -ы, *ж.*
Руск. *Авиáта*, укр. *Авіáта.*

АВУДЗІ́М (Avudzim) -а, *м.* Авудзíмавіч, Авудзíмаўна. Ст. рэдк.

Вытворныя: Дзíма.
Руск. *Авудúм*, укр. *Авудúм.*
[Грэч. *aoidimos* – услаўлены, у песнях усхвалены]

АВУ́НДЗІЙ (Avundzi) -я, *м.* Авýндзіевіч, Авýндзіеўна. Ст. рэдк.
Руск. *Авýндий,* укр. *Авýндій.*
[Лац. *abundus* – багаты, пышны, шчодры; *abundo* – быць багатым на што-небудзь, знаходзіцца ў вялікай колькасці]

АВЯЛІ́НА (Avialina) -ы, *ж.*
Вытворныя: Лíна, Авялíнка.
Англ. *Eveline, Evelina,* балг. *Евелина, Евка*, венг. *Evelin, Evelina,* іт., літ., польск., славац., славен., чэш. *Evelina,* ням. *Eveline, Eweline, Evelyn, Evelin(a),* руск. *Авелúна,* укр. *Евелíна,* франц. *Éveline.*

АВЯНІ́Р (Avianir) -а, *м.* Авянíравіч, Авянíраўна.
Вытворныя: Áва, Нíра, Вінýсь.
Англ. *Abner,* руск. *Авенúр,* укр. *Авенíр.*
[Ст.-яўр. імя *Abner* <*'abnēr* – бацька (Бог) ёсць]
Імяніны: 19 XI.

АВЯНІ́РА (Avianira) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Авянíр.
Вытворныя: Авянíрка, Áва, Вíра.
Руск. *Авенúра,* укр. *Авенíра.*
Імяніны: 19 XI.

АВЯНЦІ́Н (Aviantsin) -а, *м.* Авянцíнавіч, Авянцíнаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Авянцíнчык, Áва, Вíна.
Руск. *Авентúн,* укр. *Авентúн.*
[Лац. *Aventinus* – назва аднаго з сямі ўзгоркаў Рыма]

АВЯНЦІ́НА (Aviantsina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Авянцíн.
Вытворныя: Авянцíнка, Цíна, Íна.
Руск. *Авентúна,* укр. *Авентúна.*

АВЯР'Я́Н (Aviaryan) -а, *м.* Авяр'я́навіч, Авяр'я́наўна.
Вытворныя: Ян, Авяр'я́нчык, Авяр'я́нік, Авяр'я́нка.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Авяр'я́наў, Авер'янóўскі, Авяр'я́нчык.
Руск. *Аверья́н,* укр. *Оверья́н, Аверья́н.*
[Лац. *averto* – утрымліваць]
Імяніны: 26 III, 22 X.

АГА́ВА (Ahava) -ы, *м.* Агáвавіч, Агáваўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Агáўка, Агáша.
Руск. *Агáва,* укр. *Агáва.*
[Ст.-яўр. *hāgāb* – саранча]

АГА́П (Ahap) -а, *м.* Агáпавіч, Агáпаўна.
Вядома з XVI ст. як Агап (1541).
Вытворныя: Агáпка, Áга, Гáпа, Гáша.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Агáпаў, Гáпаў, Агáпенка.
Балг. *Агапи*, іісп. *Agapio,* руск. *Агáп,* славац. *Agap.*
[Грэч. *Agapios* – любімы <*agapaō* – любіць]
Імяніны: 22 IV, 18 VIII, 20 IX.

АГА́ПА (Ahapa) -ы, *ж.*
Вытворныя: Áга, Гáпа, Гáша, Гáня.
Руск. *Агáпа,* укр. *Агáпа.*
[Грэч. *agapē* – любоў]

АГА́ПІЙ (Ahapi) -я, *м.* Агáпіевіч, Агáпіеўна.
Гл. Агáп.
Вядома з XVI ст. як Агапий (1540), Гапей (1539).
Балг. *Агапий*, *Агапи,* руск. *Агáпий*, укр. *Агáпій.*
Імяніны: 24 I, 1, 15 III, 19, 21 VIII, 20 IX, 3 XI.

АГАПІ́Т (Ahapit) -а, *м.* Агапíтавіч, Агапíтаўна.
Вытворныя: Агапíтка, Гапíт, Гапíтка, Агáпка, Гáпка, Гáпа, Гáша.
Англ., ням. *Agapitus,* венг. *Agapét,* іт. *Agapito,* іісп. *Agapito, Agapio,* літ. *Agapitas,* польск., чэш. *Agapit,* руск. *Агапúт,* славен. *Ágapet, Agapit,* укр. *Агапúт,* франц. *Agapet, Agapit, Agapat.*
[Грэч. *agapētos* – любімы]
Імяніны: 18 II, 17 IV, 12 VI, 13 XII.

АГА́ПІЯ (Ahapiya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Ага́пій. Ст. рэдк.
Вядома з XVI ст. як Агапия (1746), Агапъя (1746), Агапя (1743), Огапья (1585), Огапя (1577), Огапка (1558), Гафия (1674), Гасута (1540).
Вытворныя: Ага́па, Ага́пка, Га́па, Га́п'я, Га́ся, А́га, Ага́ша, Га́ша.
Балг. *Агапия,* руск. *Ага́пия*, укр. *Ага́пія.*

АГАПО́Н (Ahapon) -а, *м.* Агапо́навіч, Агапо́наўна.
Гл. Агафо́н.

АГА́ТА (Ahata) -ы, *ж.*
Вытворныя: Ага́ша, Ага́шка, А́га, Агу́ня, Агу́ся, Я́га, Га́пка.
Англ. *Agatha,* балг. *Агата, Агатка,* венг. *Agáta, Agota*, іісп. *Aqueda*, іт., польск., славац., славен., чэш. *Agata,* літ. *Agota*, ням. *Agathe, Agatha*, руск. *Ага́та, Ага́фа*, укр. *Ага́та,* франц. *Agathe.*
[Грэч. *agathos* – добрая, шляхетная, храбрая, выдатная]
Імяніны: 5 II.

АГА́Ў (Ahau) -ва, *м.* Ага́вавіч, Ага́ваўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ага́ха, Ага́ня, Ага́ва.
Руск. *Ага́в*, укр. *Ага́в.*
[Ст.-яўр. *hāgāb* – саранча]

АГАФАДО́Р (Ahafador) -а, *м.* Агафадо́равіч, Агафадо́раўна. Ст. рэдк.
Руск. *Агафодо́р*, укр. *Агафодо́р.*
[Грэч. *agathos* – добры, харошы і *dōron* – дар, падарунак]
Імяніны: 7 III, 13 X.

АГАФА́НГЕЛ (Ahafanhel) -а, *м.* Агафа́нгелавіч, Агафа́нгелаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Агафа́ня, Гафа́ня, Фа́ня.
Руск. *Агафа́нгел*, укр. *Агафа́нгел.*
[Грэч. *agathos* – добры, харошы і *angelos* – вястун]
Імяніны: 7 III, 13 X.

АГАФАПО́Д (Ahafapod) -а, *м.* Агафапо́давіч, Агафапо́даўна. Ст. рэдк.
Руск. *Агафопо́д,* укр. *Агафопо́д.*
[Грэч. *agathos* – добры, харошы і *pous, podos* – нага]
Імяніны: 5 IV.

АГА́ФІЯ (Ahafiya) -і, *ж.*
Вядома з XVI ст. як Гафия (1674), Агафия (1737), Гасута (1540).
Вытворныя: Га́ся, Га́ша, Ага́ша, Га́ня, Ганю́ся, Ганю́ша, Га́па, Ага́фка, Га́пка.
Іісп. *Aqueda*, руск. *Ага́фья*, укр. *Ага́фія, Га́фія.*
[Грэч. *agathos* – добрая, харошая, шляхетная, прыстойная]
Імяніны: 5 II, 26 XII.

АГАФО́КЛІЯ (Ahafokliya) -і, *ж.* Ст. рэдк.
Руск. *Агафо́клия*, укр. *Агафо́клія.*
[Грэч. *agathos* – добрая, харошая і *kleos* – слава, чутка, вестка; добрыя чуткі]
Імяніны: 17 IX.

АГАФО́Н (Ahafon) -а, *м.* Агафо́навіч, Агафо́наўна.
Вядома з XVI ст. як Агапон (1578), Огапон (1578), Гапон (1528).
Вытворныя: Гапо́н, Гапо́нчык, Гапо́нік, Гапо́нька, Гапанюк, Га́фа, Ага́па, Гапія́н, Гапу́сь, Гапо́ша.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Агафо́наў, Агафо́ненка, Гапо́н, Гапо́наў, Гапано́віч, Гапо́ненка, Гапанёнак, Гапо́нчык, Гапо́нік, Гапо́нька, Гапанюк.
Англ. *Agatho,* венг., іісп., славен., чэш. *Agaton*, іт. *Agatone,* літ. *Agatonas,* ням., франц. *Agathon,* польск. *Agaton*, руск. *Агафо́н*, укр. *Агафо́н, Агапо́н, Гапо́н.*
[Грэч. *agathon* – дабро]
Імяніны: 10 I.

АГАФО́НІК (Ahafonik) -а, *м.* Агафо́нікавіч, Агафо́нікаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Агафо́нька, Агафо́ша, Ні́к.
Руск. *Агафо́ник*, укр. *Агафо́ник.*
[Грэч. *agathos* – добры, харошы і *nikē* – перамога]
Імяніны: 13 X.

АГАФО́НІКА (Ahafonika) -і, *ж.* І. ж. ад і. Агафо́нік. Ст. рэдк.
Вытворныя: А́га, Фо́ня, Ага́ша, Ні́ка.
Руск. *Агафо́ника*, укр. *Агафо́ника*.

АГЕ́Й (Ahei) -я, *м.* Агéевіч, Агéеўна.
Вядома з XVI ст. як Агей (1684), Огей (1567).
Вытворныя: Агéйка, Агéйчык.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Агéй, Агéеў, Агіéвіч, Агéенка, Агéйка, Агéйчык.
Англ. *Haggai*, руск. *Аггéй, Агéй*, укр. *Óгій, Огéй*.
[Ст.-яўр. імя *Haggaj*<*haggay* – святочны, урачысты]
Імяніны: 5 III, 16 XII.

АГЛАЇДА (Ahlaida) -ы, *ж.*
Вытворныя: Аглаїдка, Агла́я, Агла́ня, Агла́ша, Гла́ша, А́га, Ага́ша, Агу́ня, Агу́ля, Гу́ля, Агло́ся.
Балг. *Аглаида*, руск. *Аглаи́да*, укр. *Аглаїда*.
[Грэч. *aglaos* – бліскучы, раскошны, цудоўны і *aidos* – знешні выгляд, знешнасць]

АГЛА́Й (Ahlai) -я, *м.* Агла́евіч, Агла́еўна. Рэдк.
Вытворныя: Агла́я, Агла́ш(а).
Руск. *Аглáй*, укр. *Аглáїй*.
[Грэч. *aglaos* -- бліскучы, раскошны, цудоўны]

АГЛА́Я (Ahlaya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Агла́й.
Вытворныя: Агла́ня, Агла́нька, Агла́ша, Гла́ша.
Англ., франц. *Egle*, балг. *Аглая, Аглея, Яглая, Яглея*, руск. *Агла́я*, укр. *Агла́я*.
[Грэч. *Aglaïa*< *aglaïa* – прыгажосць, краса, бляск]

АГН (Ahn) -а, *м.* А́гнавіч, А́гнаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: А́гня, Агну́к, Агну́ль, Ану́ха.
Руск. *Агн*, укр. *Агн*.
[Грэч. *hagnos* – чысты, нявінны, бязгрэшны ці лац. *agnus* – ягня]

А́ГНА (Ahna) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Агн. Ст. рэдк.
Вытворныя: А́гня, Агню́ся, Нюша.
Балг. *Агна*, руск. *Агна*, укр. *Агна*.

АГНЕ́СА (Ahnesa) -ы, *ж.*
Вядома з XVI ст. як Агнешка (1567), Агнежка (1556), Ягнешка (1560).
Вытворныя: Агу́ня, Ягу́ня, Агу́ся, Ягу́ся, Агнéша, А́га, А́гна, А́ся.
Англ., ням. *Agnes*, балг. *Агнес, Агнеса*, венг. *Ágnes, Agnéta*, ісп. *Ines*, іт. *Agnese*, літ. *Agnietė, Agnieška, Agnyta, Agnė*, польск. *Agnieszka*, руск. *Агнéсса*, славац. *Agnesa, Agneša*, славен. *Neža, Nežka, Ines*, укр. *Агнéса*, франц. *Agnés*, чэш. *Anežka*.
[Грэч. *hagnē* – чыстая, нявінная ці лац. *agnus* – ягня]
Імяніны: 21 I, 6 III, 20 IV, 27 VIII.

АГНЕ́ТА (Ahneta) -ы, *ж.*
Вытворныя: А́гня, Агнéша, Агнéшка.
Руск. *Агнéта*, укр. *Агнéта*.

А́ГНІЙ (Ahni) -я, *м.* Агніевіч, Агніеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: А́гня, Агню́ша.
Руск. *Агний*, укр. *Агній*.
[Грэч. *hagnos* – чысты, нявінны ці лац. *agnus* – ягня]
Імяніны: 5 II.

А́ГНІЯ (Ahniya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Агній.
Вытворныя: А́гня, А́гна, А́га, Агну́ся, Агу́ся, А́ся.
Руск. *Агния, Агнéя*, укр. *Агнія*.

АГРАФЕ́НА (Ahrafena) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Агрыпа.
Гл. Агрыпіна.
Руск. *Аграфéна*, укр. *Горпи́на*.

АГРА́ФІЙ (Ahrafi) -я, *м.* Агра́фіевіч, Агра́фіеўна.
Вытворныя: Гра́фа, Графу́ля, Графу́ня, Гра́ня.
Руск. *Агра́фий*, укр. *Ага́фій*.

АГРЫ́ПА (Ahrypa) -ы, *м.* Агрыпавіч, Агрыпаўна. Ст. рэдк.

Вытворныя: Агры́пка, Гры́пка, Грыпа.
Руск. *Агри́ппа*, укр. *Агри́па*.
[Лац. *Agrippa*; грэч. *agreuō* – лавіць, хапаць *i pous* – нага]

АГРЫПІ́НА (Ahrypina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Агры́па.
Вядома з XVI ст. як Огреня (1558), Огрефина (1558), Огрепина (1540), Огрефена (1540).
Вытворныя: Агру́ся, Гру́ня, Грыпі́на, Рыпі́на, Рыпа, Пі́на, Іна.
Руск. *Агрипи́на*, укр. *Агрипи́на, Горпи́на*.
Імяніны: 23 VII.

А́ДА (Ada) -ы, *ж.*
Вытворныя: А́дка, А́дачка.
Англ. *Adda*, польск. *Ada*, руск. *А́да*, укр. *А́да*.
[Ст.-яўр. імя *'Ādā* – аздоба, упрыгожанне <*'ādā* – прыбіраць, убіраць]
Імяніны: 28 VII.

АДАЛІ́НА (Adalina) -ы, ж. Запаз.
Вытворныя: А́да, Лі́на, Алі́на.
Англ. *Adaline, Adelina, Adeline, Edeline*, балг. *Адела, Аделина*, венг. *Adelina*, ням. *Adeline*, польск. *Adelina*, руск. *Аделина́*, укр. *Аделі́на*, франц. *Adelina, Adeline*.
[Ст.-герм. *adal* – высакародны, прыстойны]
Імяніны: 28 VIII.

АДА́М (Adam) -а, *м.* Ада́мавіч, Ада́маўна.
Вядома з XVI ст. як Адам (1528).
Вытворныя: Ада́мка, Адамко́, Адаме́ц, Ада́мчык, Ада́мейка, Ада́мушка, Адамчу́к, Ада́сь, Ада́ська, Ада́ш, Ада́шка, Ада́шчык, Адашчу́к.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Ада́маў, Адамо́віч, Ада́міч, Адамёнак, Адаме́ц, Адамцэ́віч, Адамке́віч, Ада́мчык, Адаме́йка, Ада́мушка, Адамчу́к, Ада́сь, Ада́ська, Адашэ́нка, Ада́шкін, Адашке́віч, Ада́шчык, Адашчу́к, Адамі́цкі.
Англ., ням., польск., славац., славен., франц. *Adam*, балг. *Адам, Даме*, венг. *Ádam*, ісп. *Adan*, іт. *Adamo*, літ. *Adoms*, руск. *Ада́м*, укр. *Ада́м*.
[Ст.-яўр. *'ādām* – чалавек]
Імяніны: 6 IV, 24 XII.

АДАНА́Й (Adanai) -я, *м.* Адана́евіч, Адана́еўна.
Руск. *Адона́й*, укр. *Адона́й*.

АДО́ЛЬФ (Adolf) -а, *м.* Адо́льфавіч, Адо́льфаўна.
Вядома ў Польшчы з XIII ст.
Вытворныя: До́льф, До́лік, До́лусь, Адалю́к.
Англ. *Adolph, Adolphus*, венг., ням., польск., чэш. *Adolf*, ісп., іт. *Adolfo*, літ. *Adolfas, Dulpis*, руск. *Адо́льф*, славац. *Adolf, Dolfe*, укр. *Адо́льф*, франц. *Adolphe*.
[Ст.-герм. *adal* – высакародны і *wolf* – воўк]
Імяніны: 13 II, 17 IV, 16 XII.

АДО́ЛЬФІНА (Adolfina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Адо́льф.
Вытворныя: До́ля, Фі́на, Іна.
Польск. *Adolfina*, руск. *Адельфи́на*, укр. *Адельфі́на*, чэш. *Adolfina*.
Імяніны: 13 II, 17 IV, 16 XII.

АДО́НІС (Adonis) -а, *м.* Адо́нісавіч, Адо́нісаўна. Запаз.
Руск. *Адо́нис*, укр. *Адони́с*.
[Ст.-яўр. *'adōn* – пан, уладар]

АДРЫЯ́Н (Adryian) -а, *м.* Адрыя́навіч, Адрыя́наўна.
Вытворныя: Адрыя́нка, Я́нка, Адрыя́ша, Я́ша.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Адрыя́наў, Дро́наў, Драню́к, Дране́ц.
Англ., ням., польск. *Adrian, Hadrian*, балг. *Адриан, Адриян*, венг. *Adorján*, ісп. *Adriano, Adrian*, іт. *Adriano*, літ. *Adrijonas*, руск. *Адриа́н*, укр. *Адріа́н, Адріян*, франц. *Adrien*, чэш. *Adrian, Adrian, Hadrián*.
[Лац. *Adrianus* – чалавек, які паходзіць з г. Адрыя]
Імяніны: 9 I, 4, 23 III, 8 VII, 8 IX.

АДРЫЯ́НА (Adryiana) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Адрыя́н.

Балг. *Адриана*, *Адрияна*, *Андриана*, *Андрияна*, руск. *Адриа́на*, укр. *Адріа́на*.

АДУА́РД (Aduard) -а, *м.* Адуа́рдавіч, Адуа́рдаўна.
Гл. Эдуа́рд.

АДЭЛАІ́ДА (Adelaida) -ы, *ж.*
Вытворныя: Адэ́ля, Адэ́лька, Іда.
Англ., іт. *Adelaide*, венг. *Etelka*, ісп., славац., чэш. *Adelaida*, ням. *Adelaide*, *Adelheid*, польск. *Adelajda*, руск. *Аделаи́да*, славен. *Adelajda*, укр. *Аделаї́да*, франц. *Adélaïde*.
[Ст.-герм. *adal* – шляхетны і *heit* – становішча, маёмасць]
Імяніны: 5 II, 11 VI, 16 XII.

АДЭ́ЛЬФІЙ (Adelfi) -я, *м.* Адэ́льфіевіч, Адэ́льфіеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Адэ́ль, Дэ́ля.
Руск. *Адéльфий*, укр. *Адéльфій*.
[Грэч. *adelphós* – братні, братэрскі]

АДЭЛЬФІ́НА (Adelfina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Адэ́льфій. Ст. рэдк.
Вытворныя: Адэльфі́нка, Адэ́льфа, Фі́на, І́на.
Руск. *Адельфи́на*, укр. *Адельфі́на*.
Імяніны: 13 II, 17 IV, 16 XII.

АДЭ́ЛЯ (Adelia) -і, *ж.*
Англ., славац., славен. *Adela*, венг. *Adél*, іт. *Adele*, літ. *Adelė́*, ням. *Adele*, *Adela*, польск. *Adela*, руск. *Оде́лия*, укр. *Оде́лія*, *Адéля*, *Оде́ля*, франц. *Adele*, чэш. *Adela*.
[Лац. *Adela* са ст.-герм. *adal* – высакародны]
Імяніны: 3 І, 23 XI, 24 XII.

А́ЗА (Aza) -ы, *ж.*
Вытворныя: А́зка.
Руск. *А́за*, укр. *А́за*.
[Тат.<арабск. *'azā* – заспакаенне]

А́ЗА (Aza) -ы, *м.* А́зіч, А́зічна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Азо́н, Азо́нчык, Азо́й, Азо́ля, Азу́ка, Азёма, Азёмша, Аза́р.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Азе́віч, Азано́віч, Азо́нчык, Азрэ́нка, Азо́лін, Азёма, Азёмша, Азу́ка.
Англ. *Asa*, руск. *А́за*, укр. *А́за*.
[Ст.-яўр. *āsā* – лекар]

АЗАДА́Н (Azadan) -а, *м.* Азада́навіч, Азада́наўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: А́за, А́зя.
Руск. *Азада́н*, укр. *Азада́н*.

АЗА́ЛІЯ (Azaliya) -і, *ж.* Запаз.
Вытворныя: А́за, За́ля, За́ла.
[Грэч. *azaleos* – сухі, высахлы >лац. *azalea* – дэкаратыўная расліна сямейства верасковых, якая расце і на сухой глебе]

АЗА́Р (Azar) -а, *м.* Аза́равіч, Аза́раўна.
Вядома з XVI ст. як Азар (1614), Озар (1588).
Вытворныя: Аза́рка, А́за, За́ра, За́рык.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Аза́раў, Азаро́віч, Азарэ́віч, Аза́ранка, Аза́ранкаў, Азарэ́нка, Азаро́нак, Аза́рка, Азаркéвіч, Аза́рчанка.
Руск. *Аза́р*, укр. *Аза́р*.
[Ст.-яўр. імя *'Azarjā* – Яхве (Бог) памог]
Імяніны: 3 II, 17 XII.

АЗА́РЫЙ (Azary) -я, *м.* Аза́рыевіч, Аза́рыеўна.
Гл. Аза́р.
Руск. *Аза́рий*, укр. *Аза́рій*.

АЗА́Т (Azat) -а, *м.* Аза́тавіч, Аза́таўна.
Вытворныя: А́за.
Руск. *Аза́т*, укр. *Аза́т*.

АІ́ДА (Aida) -ы, *ж.* Запаз.
Вытворныя: І́да, І́дка, А́да, Аі́дка.
Венг., ісп., іт., славац., чэш. *Aida*, руск. *Аи́да*, укр. *Аї́да*.
[Арабск. *'āida* – карысць, узнагарода; паводле імя гераіні оперы Дж. Вердзі «Аіда»]
Імяніны: 2 І.

АІФА́Л (Aifal) -а, *м.* Аіфа́лавіч, Аіфа́лаўна. Ст. рэдк.

Вытворныя: Фа́ля, І́фа, Фа́лка.
Руск. *Аифа́л*, укр. *Аїфа́л.*

АЙФА́Л (Aifal) -а, *м.* Айфа́лавіч, Айфа́лаўна.
Вытворныя: Фа́ла, Фа́лька.
Руск. *Айфа́л*, укр. *Аїфа́л.*

АКА́ (Aka) -і, *м.* Акі́ч, Акі́нічна.
Руск. *Ока́*, укр. *Ока́.*

АКА́КІЙ (Akaki) -я, *м.* Ака́кіевіч, Ака́кіеўна. Ст. рэдк.
Вядома з XV ст. як Акакий (1479).
Англ. *Acacius,* венг. *Akács,* ісп., іт. *Acacio*, літ. *Akacijus,* ням. *Achatius, Akazius, Achaz, Achatz,* польск. *Achacjusz, Achacy,* руск. *Ака́кий*, укр. *Ака́кій,* франц. *Acace.*
[Грэч. *akakos* – нявінны, незласлівы, добры]
Імяніны: 9, 31 III, 17 IV, 7, 19 V, 7, 26 VII, 15 IX, 29 XI.

АКЕ́ПСІЙ (Akepsi) -я, *м.* Акéпсіевіч, Акéпсіеўна. Ст. рэдк.
Руск. *Акéпсий*, укр. *Акéпсій.*

АКЕ́ПСІМ (Akepsim) -а, *м.* Акéпсімавіч, Акéпсімаўна. Ст. рэдк.
Руск. *Акéпсим*, укр. *Акéпсим.*

АКЗЕ́ЛЬМ (Akzelm) -а, *м.* Акзе́льмавіч, Акзе́льмаўна.
Вытворныя: Акзэ́льмусь, Зэ́льма.
Руск. *Акзе́льм*, укр. *Акзе́льм.*
[Магчыма, ад сканд. *Axel, Aksel> Absalom*]

АКІ́ЛА (Akila) -ы, *м.* Акі́лавіч, Акі́лаўна. Ст.рэдк.
Гл. Акýла.
Вытворныя: Акі́лка.
Англ. *Aquila,* руск. *Аки́ла*, укр. *Аки́ла.*
[Лац. *Aquila* – арол]
Імяніны: 4, 21 I, 14 VII, 28 VIII.

АКІЛІ́НА (Akilina) -ы, *ж.*
Вытворныя: Акілі́нка, Кілі́нка, Кі́ля, Акулі́нка, Кулі́нка, Кулі́на.
Руск. *Акили́на*, укр. *Кили́на.*
[Лац. *aquillina* – арлі́ная]
Імяніны: 7 IV, 13 VI.

АКІ́М (Akim) -а, *м.* Акі́мавіч, Акі́маўна.
Гл. Якім.
Вядома з XVII ст. як Аким (1691).
Вытворныя: Акімéц, Акімка, Акімушка, Акімчык, Акімýк, Акімчýк.
Руск. *Аки́м*, укр. *Яки́м.*
[Ст.-яўр. *yehō-yāqīm* – Бог паставіў, Бог зацвердзіў]
Імяніны: 26 VII, 16 VIII.

АКІНДЗІ́Н (Akindzin) -а, *м.* Акіндзі́навіч, Акіндзі́наўна.
Вытворныя: Акіндзі́нка, Дзі́нка, Дзі́на, Кі́на.
Руск. *Акинди́н*, укр. *Акинди́н.*
[Грэч. *akindynos* – бяспечны]

АКІ́НФ (Akinf) -а, *м.* Акі́нфавіч, Акі́нфаўна.
Гл. Іакі́нф.
Вытворныя: Канці́сь, Яко́нт, Акі́ня, Кі́ня, Кі́нф.
Руск. *Аки́нф*, укр. *Аки́нф.*
[Грэч. *hyakinthos* – яхант]
Імяніны: 3, 18 VII, 24 XII.

АКСА́НА (Aksana) -ы, *ж.*
Вытворныя: Аксáнка, Ксáна, Сáна.
Руск. *Оксáна*, укр. *Оксáна.*
[Укр. размоўная форма імя *Ксенія*, якая стала дакументальнай]

АКСЁН (Aksion) -а, *м.* Аксёнавіч, Аксёнаўна.
Гл. Аўксéнцій.
Вядома з XVI ст. як Аксён (1647), Оксен (1567).
Вытворныя: Аксéнчык, Аксёнчык, Аксю́та, Аксю́к, Аксянчýк, Аксянцю́к, Аксéнь, Аксéль.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Аксёнаў, Аксянéвіч, Аксянóвіч, Аксінóвіч, Аксёненка, Аксянёнак, Аксéнчык, Аксёнчык, Аксю́та, Аксю́таў, Аксючэ́нка, Аксю́чыц, Аксянчýк, Аксянцю́к, А́ксень, А́ксель.
Руск. *Аксён,* укр. *Оксéн.*
[Грэч. *Auxentios<auxanō* – павялічвацца, памнажацца, узрастаць]
Імяніны: 14 II, 18 IV, 12 VI, 13 XII.

АКСІ́ННЯ (Aksinnia) -і, *ж.*
Вядома з XVI ст. як Ксения (1746), Аксиня (1578), Оксиня (1578), Оксинья (1565), Оксимья (1540), Оксимка (1556), Оксюха (1541), Аксюта (1746), Оксюта (1567).
Вытворныя: Аксі́ня, Аксе́ня, А́кся, Аксю́ня, Аксю́та, Аксю́ша, А́ся, Ксю́ша, Ксю́ра, Ксю́ня.
Англ., іісп., ням. *Xenia*, балг. *Аксения, Аксиния,* венг., славац. *Xénia,* польск. *Ksenia*, руск. *Ксе́ния*, укр. *Аксе́нія, Оксе́нія, Ксе́нія,* чэш. *Xenie.*
[Грэч. *Xenía<xenia* – гасціннасць ці *xénios* – іншаземнасць]
Імяніны: 24 I, 16 IV.

АКТА́ВІЙ (Aktavi) -я, *м.* Акта́віевіч, Акта́віеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Акта́ва, Та́ва, А́ва.
Англ. *Octavius*, венг. *Oktáv,* іісп. *Octavio,* іт. *Ottavio*, літ. *Oktavijus, Oktavas,* польск. *Oktawiusz,* руск. *Окта́вий,* славац. *Oktávius,* славен. *Oktavij*, укр. *Окта́вій*, франц. *Octave,* чэш. *Oktavius.*
[Лац. *octāvus* – восьмы]
Імяніны: 20 XI.

АКТА́ВІЯ (Aktaviya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Акта́вій. Ст. рэдк.
Вытворныя: А́ва, Та́ва, А́ка.
Англ., іісп. *Octavia*, балг. *Октавия*, венг., славац. *Oktávia,* іт. *Ottavia,* літ. *Oktavija,* ням. *Octavia, Oktavia*, польск. *Oktawia,* руск. *Окта́вия,* укр. *Окта́вія*, франц. *Octavie,* чэш. *Oktávie, Oktavie.*
Імяніны: 16 III, 6 VIII, 20 XI.

АКТАВІЯ́Н (Aktaviyan) -а, *м.* Актавія́навіч, Актавія́наўна. Запаз.
Вытворныя: Акта́ва, А́ва, Актавія́нак.
Англ., франц. *Octavian*, венг. *Oktávián,* іісп. *Octaviano,* літ. *Oktavijonas,* ням. *Oktavian,* польск. *Oktawian,* руск. *Октавиа́н,* славац., чэш. *Oktavijan,* укр. *Октавіа́н.*
[Лац. *Octavianus<octāvus* – Актавіяў]
Імяніны: 6 VIII, 23 XII.

АКУ́ЛА (Akula) -ы, *м.* Аку́лавіч, Аку́лаўна.
Засведчана з XVI ст. як Окула (1528), Акула (1578), Окуля (1633), Вакула (1577).
Вытворныя: Аку́лка, Аку́лік.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Аку́ла, Аку́лаў, Аку́ліч, Акуло́віч, Акуле́нка, Аку́лінка, Акулёнак, Аку́лка, Аку́лік, Акулі́нскі.
Англ. *Aquila,* руск. *Аку́ла, Аки́ла,* укр. *Аку́ла, Аки́ла.*
[Лац. *aquila* – арол; грэч. *eakulos* – ядомы жолуд, плод дуба]
Імяніны: 4, 21 I, 14 VII, 28 VIII.

АКУЛІ́НА (Akulina) -ы, *ж.*
Вытворныя: Акулі́та, Кулі́та, Кулі́на, Аку́ля, Лі́на, Ку́ля.
Руск. *Акили́на, Акули́на, Кули́на,* укр. *Кили́на, Кули́на, Якили́на.*
[Лац. *aquillina* – арлі́ная; грэч. *Akylinē*]
Імяніны: 7 IV, 13 VI.

АКУ́СЦІЙ (Akustsi) -я, *м.* Аку́сціевіч, Аку́сціеўна. Ст. рэдк.
Руск. *Аку́стий*, укр. *Аку́стій.*
[Грэч. *akostos* – пачуты]

АКУЦІЁН (Akutsiyon) -а, *м.* Акуціёнавіч, Акуціёнаўна. Ст. рэдк.
Руск. *Акути́он*, укр. *Акуті́он.*
[Лац. *acutus* – востры]

АКЦЯБРЫ́Н (Aktsiabryn) -а, *м.* Акцябры́навіч, Акцябры́наўна. Нов.
Вытворныя: А́кця, А́ка.
Руск. *Октябри́н*, укр. *Октябри́н.*
[У гонар *Октябрьской революции*]

АКЦЯБРЫ́НА (Aktsiabryna) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Акцябры́н. Нов.
Вытворныя: Акцябры́нка, А́кця, А́ця, А́ка, Брына, Рына.
Руск. *Октябри́на,* укр. *Октябри́на.*

А́ЛА (Ala) -ы, *ж.*
Вытворныя: А́ла, А́ля, Алю́ня, Алю́ся.
Руск. *А́лла,* укр. *А́лла.*

АЛАІ́З (Alaiz) -а, *м.* Алаі́завіч, Алаі́заўна.

Вытворныя: Ала, Алаізік, Алёйза, Альдзісь.
Англ. *Aloysius, Aloys*, венг. *Alojos*, ісп. *Aloisio*, іт. *Aloisio, Luigi*, літ. *Aloizas, Aloyzas, Alyzas*, ням. *Alois, Aloisius, Aloys, Aloysius*, польск. *Alojzy*, руск. *Алóиз*, славен. *Alojzij, Alojz, Lojze*, укр. *Алóиз*, франц. *Aloyse, Louis*, чэш. *Alois, Aloiz*.
[Ст.-ням. *alwisi* – мудры]
Імяніны: 21 VI.

АЛАІ́ЗА (Alaiza) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Алаіз.
Вытворныя: Ала, Лáйзіка, Іза.
Англ. *Aloisia, Aloisa, Aloysia*, венг. *Alojzia*, ням. *Aloisia, Aloysia*, польск. *Alojza, Alojzja*, руск. *Алóиза*, славац. *Alojzia*, славен. *Alojzija, Lojzka*, чэш. *Aloisie, Alojzie*.
Імяніны: 21 VI.

АЛАФЁРН (Alafern) -а, *м.* Алафёрнавіч, Алафёрнаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ала, Алáф.
Руск. *Олофёрн*, укр. *Олофёрн*.

АЛЕ́Г (Aleh) -а, *м.* Алéгавіч, Алéгаўна.
Вытворныя: Алік, Лёка, Лёша, Алéжка.
Балг. *Олег, Алег*, ням. *Helge*, руск. *Олéг*, укр. *Олéг*.
[Сканд. *Helgė<helgi* – святы]
Імяніны: 20 IX.

АЛЕКСАНДРЫ́Н (Aleksandryn) -а, *м.* Александрынавіч, Александрынаўна. Рэдк.
Вытворныя: Сáня, Сáша, Алéкса, Сáндра.
Руск. *Александри́н*, укр. *Олександри́н*.
[Лац. *Alexandrinus* – Аляксандраў]

АЛЕКСАНДРЫ́НА (Aleksandryna) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Александрын. Рэдк.
Вытворныя: Сáня, Сáша, Александрынка, Сáндра.
Балг. *Александри́на*, руск. *Александри́на*, укр. *Олександри́на*.

АЛЕ́КСІЙ (Aleksi) -я, *м.* Алéксіевіч, Алéксіеўна. Ст. форма.
Гл. Аляксéй.
Засведчана ў XVIII ст. як Алексій (1751).
Вытворныя: Алéкса.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Алексіéвіч, Алéксін, Алéксіч.
Руск. *Алéксий*, укр. *Олéксій, Олéкса*.
[Грэч. *alexō* – абараняць, ахоўваць]
Імяніны: 12 II, 17 III, 24 IV, 20 V, 9 VIII, 28 IX, 5 X, 23 XI.

АЛЕ́НА (Alena) -ы, *ж.*
Вядома з XVI ст. як Олена (1555), Алена (1609), Галена (1556), Гелена (1669), Оленіца (1556).
Вытворныя: Алéнка, Алéначка, Лéна, Лéнка, Лéначка, Лéнанька, Лянýся, Лянýля, Лёля, Лёлька, Алёна, Ялéна, Гэ́ля, Алíся, Гáлька.
Англ. *Helen, Helena, Helene*, балг. *Елена, Еленка, Елина, Еленица, Елинка, Ели, Елка, Альонка, Лена, Ленка, Леца, Алена, Аленка*, венг. *Ilona, Héla, Helén, Heléna*, ісп., іт. *Elena*, літ. *Elena, Alena, Alina*, ням. *Helene, Helena*, польск. *Helena*, руск. *Елéна*, славац. *Helena, Jelena, Jela*, укр. *Олéна*, франц. *Héléne*, чэш. *Helena*.
[Грэч. *Helenē* – сонечная <*helē* – сонечнае святло]
Імяніны: 21, 26 V, 11 VII, 16 IX.

АЛЕ́СЯ (Alesia) -і, *ж.*
Вытворныя: Алéська, Лéся, Лéська.
Венг. *Alexa*, руск. *Алéся*, укр. *Олéся, Лéся*, чэш. *Aleska*.
Імяніны: 21, 26 V, 11 VII, 16 IX.

АЛІ́М (Alim) -а, *м.* Алімавіч, Алімаўна.
Вытворныя: Алімка, Ліма, Алік.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Алімаў, Алімéнка, Алімéня, Алімёнак.
Руск. *Али́м*, укр. *Алім*.

АЛІ́МП (Alimp) -а, *м.* Алімпавіч, Алімпаўна.
Вытворныя: Алік, Ліма, Ліпа.
Балг. *Олимп*, ісп., іт. *Olimpio*, літ. *Olimpijus*, ням. *Olympius*, польск.

Olimpius, руск. *Олúмп, Олúмпий*, славен. *Olimpij*, укр. *Олíмп*, франц. *Olympiade.*
[Грэч. *Olympios* – алімпійскі]
Імяніны: 25 VII, 17 XII.

АЛІ́МПА (Alimpa) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Алíмп. Рэдк.
Вытворыя: А́ля, Лíма, Лíпа.
Англ., венг., icп., іт., славац. *Olympia,* балг. *Олúмпа,* літ *Olimpė́,* франц. *Olympe,* чэш. *Olimpie.*
Імяніны: 25 VII, 17 XII.

АЛІ́МПІЙ (Alimpi) -я, *м.* Алíмпіевіч, Алíмпіеўна. Ст. рэдк.
Гл. Алíмп.
Вытворныя: Лíма, Лíпа, Алíм, Алíп.
Балг. *Олимпи, Олимпий*, руск. *Олúмпий,* укр. *Олíмпій.*
[Грэч. *Olympios* – алімпійскі]
Імяніны: 30 VII.

АЛІ́МПІЯ (Alimpiya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Алíмпій.
Вытворныя: Лíма, Лíпа, А́ля.
Англ., ням., славац. *Olumpia*, балг. *Олимпия,* венг., icп., іт. *Olimpia,* літ. *Olimpija, Olimpe,* польск. *Olimpia,* руск. *Олúмпия,* укр. *Олíмпія,* франц. *Olympe, Olympiade,* чэш. *Olimpie.*
Імяніны: 25 VII, 17 XII.

АЛІМПІЯ́Д (Alimpiyad) -а, *м.* Алімпія́давіч, Алімпія́даўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Алíм, Лíма, Лíпа.
Руск. *Олимпиа́д*, укр. *Олимпіа́д.*
[Грэч. *Olympias, Olympiados* – Алімпійскія гульні]

АЛІМПІЯ́ДА (Alimpiyada) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Алімпія́д.
Вытворныя: А́ля, Лíма, Лíпа, А́да, Алімпія́дка.
Балг. *Олимпиада, Олимпияда*, руск. *Олимпиа́да*, укр. *Олімпіа́да,* франц. *Olympiade.*

АЛІМПІЯДО́РА (Alimpiyadora) -ы, *ж.* Ст. рэдк.
Вытворныя: Алíма, Лíма, Лíпа, До́ра, А́ля.
Руск. *Олимпиодо́ра,* укр. *Олімпіодо́ра.*
[Грэч. *Olympios* – алімпійскі і *dōron* – дар]

АЛІМПІЯ́Н (Alimpiyan) -а, *м.* Алімпія́навіч, Алімпія́наўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Алíмпа, Лíма, Лíпа.
Руск. *Олимпиа́н,* укр. *Олімпіа́н.*
[Грэч. *Olympios* – алімпійскі]

АЛІ́НА (Alina) -ы, *ж.*
Вытворныя: А́ля, Алíнка, А́лька, Алю́ся.
Англ. *Alina, Aline, Alena,* балг. *Алина, Алинка,* венг. *Alina, Alinka,* icп., іт., літ., польск., славац., чэш. *Alina,* ням. *Alina, Aline,* руск. *Алúна,* укр. *Алíна,* франц. *Aline.*
[Памянш. ад імён *Альбіна, Акіліна*]
Імяніны: 17 VI, 28 VII, 20 X, 16 XII.

АЛІНА́РХІЙ (Alinarkhi) -я, *м.* Алінáрхіевіч, Алінáрхіеўна. Ст. рэдк.
Руск. *Алинáрхий*, укр. *Алинáрхій.*

АЛІ́П (Alip) -а, *м.* Алíпавіч, Алíпаўна.
Вытворныя: Алíпа, Лíпа, Алíпік.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Алíпаў, Алíпе́нка, Алíпе́ня.
Балг. *Алипи,* руск. *Алúп*, укр. *Алúп.*
[Грэч. *alypos* – безжурботны]
Імяніны: 17 VIII, 26, 28 IX.

АЛІ́ПІЙ (Alipi) -я, *м.* Алíпіевіч, Алíпіеўна. Ст. рэдк.
Гл. Алíп.
Руск. *Алúпий*, укр. *Алúпій.*

АЛІ́СА (Alisa) -ы, *ж.* Запаз.
Вытворныя: А́ля, А́ла, Алíска.
Балг. *Алиса, Алиска,* руск. *Алúса,* укр. *Алíса,* франц. *Alice.*
[Грэч. *alētheia* – ісціна]

АЛІСКЕ́Р (Alisker) -а, *м.* Аліскéравіч, Аліскéраўна. Ст. рэдк.
Руск. *Алискéр*, укр. *Алискéр.*

АЛІХВЕ́Р (Alikhver) -а, *м.* Аліхвéравіч, Аліхвéраўна.

Вядома з XVI ст. як Олифер (1528), Олифвер (1540), Олихвер (1585), Алихвер (1726), Лыхвер (1704), Волихвер (1624).
Вытворныя: Алфе́р, Альпе́р, Аўфе́р, Аліфе́р, Аліфе́рка.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: А́льфер, Альфёраў, Альфяро́віч, Альфяро́нак, Альпяро́віч, Аўфе́р, Аліфе́р, Аліфяро́віч, Альфярэ́нка, Аліфе́рка, Аліхве́р, Аліферавец.
Іт. *Eleuterio*, руск. *Елевфе́рий*, укр. *Єлевфе́рій.*
[Грэч. *eleutheros* – свабодны, вольны]
Імяніны: 4, 8 VIII, 3 X, 15 XII.

АЛІ́ЦЫЯ (Alitsyia) -і, *ж.*
Вытворныя: А́ла, А́лка, Алі́са, Алі́ца.
Англ. *Alice, Alyce, Alys*, балг. *Алисия*, венг. *Aliz, Alicia*, ісп. *Alicia*, іт., ням. *Alice*, літ. *Alicija, Ale*, польск. *Alicja*, руск. *Али́ция*, славен. *Alicija, Alica*, славац. *Alica*, укр. *Али́ція*, франц., чэш. *Alice.*
Імяніны: 15 II, 18 V, 21 VI, 1 IX.

АЛО́НІЙ (Aloni) -я, *м.* Ало́ніевіч, Ало́ніеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ало́ня, Ло́ня.
[Калька з грэч. *pistis* – вера]
Імяніны: 17 IX.

ВЕРАНІ́К (Veranik) -а, *м.* Верані́кавіч, Верані́каўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ве́рык, Нік.
Руск. *Верони́к*, укр. *Вероні́к.*
[Грэч. *pherō* – несці і *nikē* – перамога]

ВЕРАНІ́КА (Veranika) -і, *ж.* І. ж. ад і. Верані́к.
Вядома з XVIII ст. як Вероника (1704).
Вытворныя: Ве́ра, Ні́ка, Верані́чка, Ві́ка, Ві́чка.
Англ., ісп., іт. *Veronica,* балг. *Вероника*, венг. *Veronika, Veron, Vera*, літ. *Veronika, Veré*, ням., славац., славен., чэш. *Veronika*, руск. *Верони́ка*, укр. *Вероні́ка,* франц. *Vèronique.*
Імяніны: 13 I, 4 II, 17 V, 9 VII.

ВЕРАНІ́Я (Veraniya) -і, *ж.*
Вытворныя: Ве́ра, Вера́ня, Веру́ся, Веру́ня.
Руск. *Веро́ния*, укр. *Веро́нія.*
Імяніны: 5 X.

ВЕРАЦЫЯ́Н (Veratsyian) -а, *м.* Верацыя́навіч, Варацыя́наўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ве́ра, Ве́рык, Рацыя́н.
Руск. *Вероциа́н*, укр. *Вероціа́н.*

ВЕРК (Verk) -а, *м.* Ве́ркавіч, Ве́ркаўна. Ст. рэдк.
Вядома з XVIII ст. як Веркей (1769).
Вытворныя: Ве́ра, Ве́рык, Вярке́й.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Ве́ркін, Вярко́віч, Вярке́еў, Вярко́ўскі.
Руск. *Верк*, укр. *Верк.*

ВЕ́СТА (Vesta) -ы, *ж.*
Вытворныя: Ве́та, Ве́стачка.
Англ. *Vesta*, руск. *Ве́ста*, укр. *Ве́ста.*
[Лац. *Vesta* <грэч. *hestia* – хатні ачаг].

ВЕСЯЛІ́Н (Vesialin) -а, *м.* Весялі́навіч, Весялі́наўна. Ст. рэдк.
Балг. *Веселин, Весел, Веско, Весо, Вецо,* руск. *Весели́н*, укр. *Весели́н.*

ВЕСЯЛІ́НА (Vesialina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Весялі́н. Ст. рэдк.
Балг. *Веселина, Весела, Веселка, Веса, Веска,* руск. *Весели́на*, укр. *Весели́на.*

ВІВЕ́Я (Viveya) -і, *ж.* Ст. рэдк.
Вытворныя: Ві́ва, Ве́я.
Руск. *Виве́я,* укр. *Вевея́.*
[Лац. *vivo* – жыць]

ВІВІ́Н (Vivin) -а, *м.* Вівіна́віч, Вівіна́ўна. Ст. рэдк.
Руск. *Виви́н*, укр. *Вівін.*
[Лац. *vivus* – жывы, жывучы]

ВІВІЯ́Н (Viviyan) -а, *м.* Вівія́навіч, Вівія́наўна.
Вытворныя: Вівя́н, Вівя́н, Я́н.
Англ., польск. *Vivian*, руск. *Вивиа́н*, укр. *Вівіа́н,* франц. *Vivien.*
[Лац. *vivus* – жывы, жывучы]
Імяніны: 2 XII.

ВІВІЯ́НА (Viviyana) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Вівія́н.
Вытворныя: Ві́ва, Я́на, Вівія́нка.
Англ. *Vivian, Viviana, Vivien, Vievienne,* венг. *Viviána, Vivien,* ісп. *Viviana,* іт. *Vibiana*, літ. *Vibijoné, Viviana,* ням. *Viviane, Viviana*, польск. *Wiwiana,* руск. *Вивиа́на,* укр. *Вівіа́на.*
Імяніны: 2 XII.

ВІДА́НА (Vidana) -ы, *ж.* Ст. рэдк.
Вытворныя: Віда́нка, Ві́да, Да́на.
Балг. *Вида, Виденка,* руск. *Вида́на*, укр. *Віда́на.*
[Лац. *video* – бачыць]

ВІЁЛА (Viyola) -ы, *ж.*
Вытворныя: Віёлка, Ёла, Ві́ла.
Англ. *Viola*, літ. *Vijolé, Violé,* іт. *Viola,* ням. *Viola,* венг. *Ibolya,* руск. *Виóла*, укр. *Віóла*, чэш. *Viola.*
[Лац. *viola* – фіялка]
Імяніны: 29 X.

ВІКЕ́НЦІЙ (Vikentsi) -я, *м.* Віке́нцьевіч, Віке́нцьеўна.
Гл. Вінцэ́нт.
Вытворныя: Ві́на, Ке́ня.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Віке́нцьеў.
Балг. *Викенти,* руск. *Вике́нтий*, укр. *Віке́нт, Віке́нтій.*
[Лац. *vinco* – перамагаць]
Імяніны: 22 I, 8 III, 19 VII.

ВІКЕ́НЦІЯ (Vikentsiya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Віке́нцій.
Вытворныя: Ві́ка, Ке́ня.
Руск. *Вике́нтия*, укр. *Віке́нтія.*

ВІ́КТАР (Viktar) -а, *м.* Ві́ктаравіч, Ві́ктараўна.
Вядома з XVI ст. як Виктор (1558), Вихтор (1567).
Вытворныя: Ві́ктусь, Ві́ктóрчык, Ві́ця, Ві́цька, Ві́цю́к, Ві́цю́ша, Ві́цю́ня, Ві́цю́ся.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Ві́ктараў, Ві́ктарóвіч, Ві́ктóрчык, Ві́цянкóў, Ві́цькó, Ві́цюгóў.
Англ., іісп., франц. *Victor,* балг. *Виктор, Вика, Вики*, венг. *Győző, Viktas*, іт. *Vittore, Vittorio,* літ. *Viktoras, Viktas*, польск. *Wiktor*, ням. *Viktor, Victor*, руск. *Ви́ктор*, славац., чэш. *Viktor*, славен. *Viktor, Zmago,* укр. *Ві́ктор.*
[Лац. *Victor* – пераможца]
Імяніны: 6 III, 12 IV, 28 VII, 1 IX, 17 X.

ВІКТАРЫ́Н (Viktaryn) -а, *м.* Ві́ктарыінавіч, Ві́ктарыінаўна.
Вядома з XVI ст. як Викторин (1567), Викторын (1576).
Вытворныя: Ві́кта, Ві́та, Ві́та́ха, Ві́та́ша.
Англ. славац., славен., чэш. *Viktorin,* іісп. *Victorino*, іт. *Vittorino*, літ. *Viktorinas*, ням. *Viktorinus, Viktorin,* польск. *Wiktoryn*, руск. *Викторúн,* укр. *Ві́кторúн,* франц. *Victorin.*
[Лац. *Victorinus* – пераможны <*victoria* – перамога]
Імяніны: 5 IX.

ВІКТАРЫ́НА (Viktaryna) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Ві́ктарыін.

Англ., франц. *Victorine,* венг., славен. *Viktorina*, ісп. *Victorina,* іт. *Vittorina,* руск. *Викторúна,* укр. *Віктóрина.*
Імяніны: 20 V, 5 IX, 23 XII.

ВІКТО́РЫЙ (Viktory) -я, *м.* Віктóр'евіч, Віктóр'еўна.
Вытворныя: Віктóрык, Вíка, Тóрык, Вíта.
Руск. *Викторúй,* укр. *Віктóрій.*
[Лац. *Victor, Victoris* – пераможца]
Імяніны: 31 I, 10 III, 18 VII.

ВІКТО́РЫК (Viktoryk) -а, *м.* Віктóрыкавіч, Віктóрыкаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Вікáр, Вíта, Тóрак.
Руск. *Викторúк,* укр. *Віктóрік.*
[Лац. *Victor* – пераможца]

ВІКТО́РЫЯ (Viktoryia) -і, *ж.*
Вядома з XVII ст. як Виктория (1698).
Вытворныя: Віктóрка, Вíка, Вíта, Віцяня, Вíра, Тóра, Тóся, Тóша.
Англ., ісп. *Victoria,* балг. *Виктория, Вика, Вики,* венг., славац. *Viktória,* іт. *Vittoria,* літ. *Viktorija, Vikté,* ням. *Viktoria, Victoria,* польск. *Wiktoria,* руск. *Викто́рия*, славен. *Viktorija, Zmaga*, укр. *Віктóрія,* франц. *Victoire,* чэш. *Viktorie.*
[Лац. *Victoria* – перамога]
Імяніны: 20 V, 23 XII.

ВІКУ́Л (Vikul) -а, *м.* Вікýлавіч, Вікýлаўна. Ст. рэдк.
Гл. Вукóл.
Руск. *Викýл, Викýла,* укр. *Викýл, Викýла.*

ВІЛ[1] (Vil) -а, *м.* Вíлавіч, Вíлаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Віль, Вíлька, Вілíм, Вілю́га, Вількóта.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Вілóвіч, Віль, Вілéвіч, Вількóў, Вількóвіч, Вількóўскі, Вільчыńскі, Вількóта, Вілю́га, Вілю́ха.
Руск. *Вил*, укр. *Віл.*
[Грэч. *Bēlos* – вярхоўны бог у асíра-вавіланян]

ВІЛ[2] (Vil) -а, *м.* Вíлавіч, Вíлаўна. Нов.
Вытворныя: Вíла, Вíля.
Руск. *Вил*, укр. *Віл.*
[Ад пачатковых літар слоў у спалучэнні *Владимир Ильич Ленин*]

ВÍЛА (Vila) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Віл[1]. Ст. рэдк.
Руск. *Вúла*, укр. *Вíла.*

ВІЛÉН (Vilen) -а, *м.* Вілéнавіч, Вілéнаўна. Нов.
Вытворныя: Вíля, Вілéнчык, Лéня.
Руск. *Вилéн*, укр. *Вілéн.*
[Ад пачатковых літар і часткі слоў у спалучэнні *В. И. Ленин*]

ВІЛÉНА (Vilena) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Вілéн. Нов.
Вытворныя: Вілéнка, Вíля, Лéна, Лéнка.
Руск. *Вилéна*, укр. *Вілéна.*

ВІЛІБА́ЛЬД (Vilibald) -а, *м.* Вілібáльдавіч, Вілібáльдаўна. Ст. рэдк.
Англ. *Willibald,* венг., славац., славен., чэш. *Vilibald,* ісп., іт. *Villibaldo,* ням. *Willibald,* польск. *Wilibald,* руск. *Виллибáльд*, укр. *Віллібáльд,* франц. *Guillibaud.*
[Ст.-герм. *willo* – жаданне і *bald* – смелы]

ВІЛІКТО́Н (Vilikton) -а, *м.* Вілікто́навіч, Вілікто́наўна. Ст. рэдк.
Руск. *Виликто́н,* укр. *Виликто́н.*

ВІЛÍНА (Vilina) -ы, *ж.*
Руск. *Вилúна,* укр. *Вілíна.*

ВІЛО́РА (Vilora) -ы, *ж.* Нов.
Вытворныя: Вілóрка, Вíла, Лóра.
Руск. *Вилóра*, укр. *Вілóра.*
[Ад пачатковых літар слоў у спалучэнні *Владимир Ильич Ленин – организатор революции*]

ВІЛО́РЫЙ (Vilory) -я, *м.* Вілóр'евіч, Вілóр'еўна. Нов.
Вытворныя: Віл, Вілóр.
Руск. *Вилóрий*, укр. *Вілóрій.*

ВІЛЬГЕ́ЛЬМ (Vilhelm) -а, *м.* Вільге́льмавіч, Вільге́льмаўна.
Вытворныя: Ві́лек, Ві́люс.
Англ. *William, Willie, Will,* балг. *Вилхелм, Вили,* венг. *Vilmos,* ісп. *Guillermo,* іт. *Gugielmo,* літ. *Wilhelmas, Villemas, Vilimas, Vilius,* ням. *Wilhelm, Willi,* польск. *Wilhelm,* руск. *Вильге́льм,* славац. *Viliam,* славен. *Viljem, Vilko,* укр. *Вільге́льм,* франц. *Guillaume,* чэш. *Vilém.*
[Ст.-верх.-ням. *wil* – воля, жаданне і *helm* – шлем]
Імяніны: 6 IV, 25 VI, 2 IX.

ВІЛЬГЕЛЬМІ́НА (Vilhelmina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Вільге́льм.
Англ. *Willamina, Willa, Wilma,* венг. *Vilma, Vilhelmina,* ісп. *Guillerma, Guillermina,* іт. *Guglielmina,* літ. *Vilhelma, Vilhelmina, Vile, Mynė,* ням. *Wilhelmine, Wilhelmina, Wilhelma,* польск. *Wilhelma, Wilhelmina,* руск. *Вильгельми́на,* славац. *Vilma, Vilemina,* славен. *Viljemina,* укр. *Вільгельмі́на, Вилге́лма,* чэш. *Vilma, Viléma, Vilemina.*
Імяніны: 26 V, 25 X.

ВІ́ЛЬМА (Vilma) -ы, *ж.*
Англ. *Wilma,* венг. *Vilma,* руск. *Ви́льма,* славац. *Vilma,* укр. *Ві́льма,* чэш. *Vilma.*
Імяніны: 26 V, 25 X.

ВІЛЬЯМІ́Р (Vilyamir) -а, *м.* Вільямі́равіч, Вільямі́раўна.
Вытворныя: Ві́ля, Ві́льям, Мі́рык.
Руск. *Вильями́р,* укр. *Вільями́р.*

ВІЛЯНІ́Н (Vilianin) -а, *м.* Віляні́навіч, Віляні́наўна. Нов.
Вытворныя: Ві́ля, Ле́ня, Віле́нчык.
Руск. *Виленин,* укр. *Віленін.*
[Ад пачатковых літар і часткі слоў у спалучэнні *В. И. Ленин*]

ВІЛЯНІ́НА (Vilianina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Віляні́н. Нов.
Вытворныя: Ві́ля, Ле́на, Ві́ка, Ляні́на, Ні́на.
Руск. *Виленина,* укр. *Віленіна.*

ВІНАДО́РА (Vinadora) -ы, *ж.*
Руск. *Винадо́ра,* укр. *Вінадо́ра.*

ВІНА́ЛІЙ (Vinali) -я, *м.* Віна́льевіч, Віна́льеўна.
Руск. *Вина́лий,* укр. *Віна́лій.*

ВІНА́РЫЯ (Vinaryia) -і, *ж.*
Руск. *Вина́рия,* укр. *Віна́рія.*

ВІНФА́НЦІЙ (Vinfantsi) -я, *м.* Вінфа́нцьевіч, Вінфа́нцьеўна. Ст. рэдк.
Руск. *Винфа́нтий,* укр. *Вінфа́нтій.*

ВІНЦАНЦІ́НА (Vintsantsina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Вінцэ́нт.
Вытворныя: Вінцэ́ся.
Англ., ням. *Vincentia,* венг., славац. *Vincencia,* ісп., літ. *Vincenta,* іт. *Vincenza, Cencia, Enzia,* польск. *Wincencja, Wincentyna,* руск. *Винце́нтия, Винценти́на,* славен. *Vincencija,* чэш. *Vincencie.*
Імяніны: 7 V.

ВІНЦЭ́НТ (Vintsent) -а, м. Вінцэ́нтавіч, Вінцэ́нтаўна.
Гл. Віке́нцій.
Вядома з XVI ст. як Виценты (1540), Винценты (1670), Винаш (1540).
Вытворныя: Вінцу́к, Вінько́, Вінко́, Вінцу́сь, Вінцэ́сь.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Вінцуке́віч, Вінькевіч, Вінчо́нак, Вінко́віч.
Англ., славац., франц. *Vincent,* балг. *Викенти,* венг. *Vince, Bence,* ісп. *Vincente,* іт. *Vincenzo, Cencio, Enzio, Enzo,* літ. *Vincentas, Vincas, Vinca,* ням. *Vinzenz, Vincenz, Vincent,* польск. *Wincenty,* руск. *Вике́нтий,* славен. *Vincencij, Vincenc, Vinko,* укр. *Вікє́нтій, Вікє́нт,* чэш. *Vincenc, Čenek.*
[Лац. *Vincentius*<*vincens* – які перамагае]
Імяніны: 22 I, 8 III, 19 VII.

ВІР (Vir) -а, *м.* Ві́равіч, Ві́раўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ві́рка, Ві́рык.

Руск. *Вир*, укр. *Вір.*
[Лац. *vir* – муж, чалавек]

ВІРГІНІЯ (Virhiniya) -і, *ж.*
Вытворныя: Вірга, Гіня, Іна, Віргінька.
Англ. *Virginia, Ginger,* балг. *Виргиния, Виржиния,* венг., ісп., іт., ням., славац. *Virginia,* літ., славен. *Virginija,* польск. *Wirginia,* руск. *Виргúния,* укр. *Віргíнія,* франц., чэш. *Virginie.*
[Лац. *virgo* – дзяўчына]
Імяніны: 8 VIII.

ВІРСА́ВІЯ (Virsavija) -і, *ж.*
Вытворныя: Віра, Са́ва.
Англ. *Bathseba,* руск. *Вирса́вия,* укр. *Вірса́вія.*
[Ст.-яўр. *batšębá* – дачка клятвы]

ВІ́РЫЙ (Viry) -я, *м.* Вір'евіч, Вір'еўна.
Вытворныя: Вір, Віра, Вірык.
Руск. *Ви́рий*, укр. *Ві́рій.*
[Лац. *vir* – муж, чалавек]

ВІРЫЛА́Д (Virylad) -а, *м.* Вірыла́давіч, Вірыла́даўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Вір, Віра, Вірыла́дка.
Руск. *Вирила́д*, укр. *Віріла́д.*
[Лац. *virilis* – мужны]

ВІРЫНЕ́Я (Viryneya) -і, *ж.*
Вытворныя: Віра, Не́я, Рыня, Вірынейка.
Руск. *Вирине́я*, укр. *Віринея́.*
[Лац. *virens* – зялёны; які цвіце; малады]

ВІС (Vis) -а, *м.* Вісавіч, Вісаўна.
Руск. *Вис*, укр. *Віс.*
[Лац. *vis* – сіла]

ВІСАРЫЁН (Visaryion) -а, *м.* Вісарыёнавіч, Вісарыёнаўна.
Вытворныя: Віса, Вісар, Вісарыёнка.
Руск. *Виссарио́н*, укр. *Віссаріо́н.*
[Грэч. *Bēsariōn* – лясны]
Імяніны: 6 VII.

ВІСО́Н (Vison) -а, *м.* Вісо́навіч, Вісо́наўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Віса, Сон.
Руск. *Виссо́н*, укр. *Віссо́н.*

ВІТ (Vit) -а, *м.* Вітавіч, Вітаўна.
Вядома з XVI ст. як Вит (1528), Витко (1528), Виташ (1528), Витас (1585).
Вытворныя: Віта, Вітка, Віткó, Вітóлік, Вітóшка.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Вітка, Віткó, Віткін, Вітóлін, Вітóшкін, Віташкéвіч, Віткóўскі.
Англ. *Guy*, балг. *Витан, Вито, Витко,* венг. *Vitus, Vid, Vida, Vidos,* ісп., іт. *Vito,* літ. *Vitas,* ням. *Vitus, Veit,* польск. *Wit,* руск. *Вит,* славац., чэш. *Vit,* славен. *Vid, Vit,* укр. *Вим,* франц. *Vit, Guy.*
[Лац. *vita* – жыццё]
Імяніны: 15 VI.

ВІ́ТА (Vita) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Віт.
Вытворныя: Вітка, Вітýся, Вітýля.
Балг. *Витана, Вита*, руск. *Ви́та,* укр. *Віта.*

ВІТА́Л (Vital) -а, *м.* Вітáлавіч, Вітáлаўна.
Вытворныя: Вітáля, Віта.
Англ. *Vital,* ісп. *Vidal, Vital,* ням. *Vital,* руск. *Вита́л,* укр. *Вітáл,* франц. *Vital.*
[Лац. *vitalis* – жыццёвы]
Імяніны: 20 X.

ВІТА́ЛІЙ (Vitali) -я, *м.* Вітáльевіч, Вітáльеўна.
Вытворныя: Вітáлік, Віта, Тáля, Тáлік, Вітáха, Вітáля.
Англ. *Vital,* балг. *Виталий,* венг. *Vitális, Vitályos,* ісп. *Vidal, Vital,* іт. *Vitale,* літ. *Vitalis, Vitalius*, ням. *Vitalis, Vital, Veitel,* польск. *Witalis,* руск. *Вита́лий*, славац. *Vitális, Vitáliš, Živko,* славен. *Vit, Zivko,* укр. *Вітáлий,* франц. *Vital, Vitalis.*
[Лац *vitalis* – жыццёвы]
Імяніны: 25 I, 22, 28 IV, 20 X.

ВІТА́ЛІК (Vitalik) -а, *м.* Вітáлікавіч, Вітáлікаўна.
Вытворныя: Вітáля, Віта, Тáля.
Руск. *Вита́лик*, укр. *Вітáлик.*
[Лац. *vitalis* – жыццёвы]

ВІТА́ЛІКА (Vitalika) -і, *ж.* І. ж. ад і. Вітáлік.
Вытворныя: Вітáля, Тáля, Вíта.
Руск. *Витáлика*, укр. *Вітáлика*.

ВІТАЛІ́НА (Vitalina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Вітáлій.
Вытворныя: Віталíнка, Талíна, Талíнка, Лíна, Вíта.
Руск. *Виталúна*, укр. *Віталíна*.

ВІТАЛІ́СА (Vitalisa) -ы, *ж.*
Вытворныя: Вíта, Тáля, Віталíска.
Руск. *Виталúса*, укр. *Віталíса*.

ВІТА́ЛІЯ (Vitaliya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Вітáлій.
Вытворныя: Вітáля, Тáля, Вíта, Вíля.
Балг. *Виталия,* венг. *Vitália,* руск. *Витáлия*, укр. *Вітáлія*.

ВІТАЛІЯ́Н (Vitaliyan) -а, *м.* Віталія́навіч, Віталія́наўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Вітáля, Вíта.
Руск. *Виталиáн*, укр. *Віталіáн*.
[Лац. *vitalis* – жыццёвы]

ВІ́ТАЎТ (Vitaut) -а, *м.* Вітаўтавіч, Вітаўтаўна.
Вытворныя: Вітак, Вітусь.
Англ. *Witowt,* літ. *Vytautas,* ням. *Witowt,* руск. *Вúтовт*, укр. *Вітовт*.
[Лац. *vyti* – гнаць і *taut(a)* – люд]
Імяніны: 15 VI, 12 X, 12 XI.

ВІТО́ЛЬД (Vitold) -а, *м.* Вітóльдавіч, Вітóльдаўна. Слав.
Вытворныя: Вíта, Тóля, Вíтак.
Англ. *Witold, Witowt,* венг., славац., славен., франц., чэш. *Vitold,* ісп., іт. *Vitoldo,* літ. *Vytautas,* ням. *Witold, Vietholdt,* польск. *Witold,* руск. *Витóльд,* укр. *Вітóльд*.
[Ст.-герм. *hwit*, *wit* – белы і *hull* – узгорак]
Імяніны: 15 VI, 12 X, 12 XI.

ВІТО́ЛЬДА (Vitolda) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Вітóльд. Слав.
Вытворныя: Вíта, Тóля.
Руск. *Витóльда,* укр. *Вітóльда*.

ВІФО́НІЙ (Vifoni) -я, *м.* Віфóньевіч, Віфóньеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Вíфа, Фóня.
Руск. *Вифóний*, укр. *Віфóній*.
[Грэч. *bythos* – глыбіня, бездань]

ВІЯЛЕ́ТА (Viyaleta) -ы, *ж.*
Вытворныя: Вíта, Вітýля, Вітýся, Лéта, Вíя, Тáя.
Англ. *Violet, Vioła, Violetta, Violette,* балг. *Виолета, Виолетка, Ветка, Виола,* венг. *Ibolya, Viola, Violetta,* ісп. *Violeta,* іт., ням. *Violetta, Viola,* літ. *Violeta, Vijolė́, Violė́,* польск. *Wioleta,* руск. *Виолéтта*, славац. *Viola,* славен. *Vjoleta, Violeta,* укр. *Віолéта,* франц. *Violette,* чэш. *Viola, Violeta*.
[Лац. *Violetta*<*viola* – фіялка]
Імяніны: 29 X.

ВІЯРЫ́КА (Viyaryka) -і, *ж.* Рэдк.
Руск. *Виорúка*, укр. *Віорíка*.

ВО́ЙЦЕХ (Voitsekh) -а, *м.* Вóйцехавіч, Вóйцехаўна. Слав.
Вядома з XVI ст. як Войтех (1528), Войцех (1599), Войтко (1528), Войтюк (1597), Войташ (1541), Войчис (1540), Войч (1540).
Вытворныя: Вайцéшык, Вайцéшчык, Вóйтка, Вайткó, Вóйцік, Вýйцік, Вайтýк, Вайцю́к, Вайцю́ль, Вóйтуль, Вайцю́х.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Вайцяхóвіч, Вайцэхóвіч, Вайцяшóнак, Вайцéшык, Вайцéшчык, Вайцéнка, Вóйтка, Вайткéвіч, Вóйцік, Вýйцік, Вайтусéвіч, Вайцю́к, Вайцю́ль, Вайцюлéвіч, Вóйтуль, Вайцюшóнак, Вайцяхóўскі, Вацыхóўскі.
Англ. *Adelbert, Ethelbert,* балг. *Адалберт,* венг. *Adalbert, Béla,* ісп., іт. *Adalberto*, літ. *Vaitiekus, Adalbertas, Vaitkus,* ням. *Adalbert, Adelbert,* польск. *Wojciech*, руск. *Вóйтех*, славац. *Vojtech,* славен. *Vojteh, Vojtek*, укр. *Вóйтех*, франц. *Adalbert,* чэш. *Vojtěch*.
[Ад асноў са значэннем *вой* – ваяўнік і *цех* – уцеха, пацеха]
Імяніны: 23 IV.

ВО́ЛЬГА (Volha) -і, *ж.*
Вядома з XVI ст. як Олюхна (1541).
Вытворныя: Во́ля, О́ля, Во́лька, О́лька.
Руск. *О́льга,* укр. *О́льга.*
[Ст.-сканд. *Heilga<heila – святая*]
Імяніны: 11 VII.

ВО́ЛЯ (Volia) -і, *ж.* Нов.
Вытворныя: Во́лька, Во́ля.
Руск. *Во́ля*, укр. *Во́ля.*
[Ужыванне агульнага наз. *воля* ў якасці асабовага імя]

ВУКО́Л (Vukol) -а, *м.* Вуко́лавіч, Вуко́лаўна.
Вядома з XVI ст. як Вукол (1653), Укол (1577), Вакула (1577), Вокула (1528).
Вытворныя: Вуко́лка, Вікýлка, Вікýха, Вікýша, Вакýла, Вакýльчык, Вакулю́к.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Вакýла, Вакýліч, Вакýльчык, Вакулю́к.
Руск. *Вукóл*, *Викýл, Викýла,* укр. *Вукóл, Викýл, Викýла.*
[Грэч. *Boukolos* – пастух]
Імяніны: 6 II.

ВЫШАСЛА́Ў (Vyshaslau) -ва, *м.* Вышасла́вавіч, Вышасла́ваўна. Слав. рэдк.
Вытворныя: Сла́ва.
Балг. *Вишеслав,* руск. *Вышесла́в.*
[Ад асноў са значэннем *вышэй, вышыня* і *слава*]

ВЯВЕ́Я (Viaveya) -і, *ж.* Рэдк.
Вытворныя: Вявéйка, Вéя.
Руск. *Вевéя*, укр. *Вевéя.*
[Грэч. *bebaia* – надзейная, моцная]

ВЯНА́НЦІЙ (Vianantsi) -я, *м.* Вяна́нцьевіч, Вяна́нцьеўна. Рэдк.
Вытворныя: Вяна, На́ня.
Венг. *Venánc, Venánt,* ісп. *Venancio,* іт. *Venanzio,* літ. *Venancijus, Venantas,* ням., чэш. *Venantius,* руск. *Вена́нтий*, славац. *Venancij,* укр. *Вена́нтій,* франц. *Venance.*
[Лац. *venans* – які палюе]

ВЯНЕ́РА (Vianera) -ы, *ж.*
Вытворныя: Вянéрка, Нéра, Вéра.
Англ., ням., франц. *Venus*, балг. *Венера,* руск. *Вене́ра*, укр. *Вене́ра.*
[Лац. *Venus, Veneris* – імя ст.-рымск. багіні кахання і прыгажосці]

ВЯНЕ́РЫЙ (Vianery) -я, *м.* Вяне́рыевіч, Вянéрыеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Вéня, Нéра.
Руск. *Вене́рий*, укр. *Вене́рій.*
[Лац. *Venerius* – Вянерын; які служыць багіні Вянеры, жрэц Вянеры]

ВЯНУ́СТ (Venust) -а, *м.* Вянýставіч, Вянýстаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Вéня, Ýста.
Руск. *Венýст,* укр. *Венýст.*
[Лац. *venustus* – вытанчаны, прыгожы, прывабны]

ВЯНУ́СТА (Venusta) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Вянýст. Слав. рэдк.
Вытворныя: Вéна, Вéня, Ýста.
Руск. *Венýста,* укр. *Венýста.*

ВЯРГІ́НІЙ (Viarhini) -я, *м.* Вяргíньевіч, Вяргíньеўна.
Вытворныя: Вяргíн, Гíна.
Балг. *Вергин,* руск. *Виргúний*, укр. *Віргíній.*
[Лац. *virginius* – дзявоцкі, нявінны]

ВЯРГІ́НІЯ (Viarhiniya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Вяргíній.
Вытворныя: Вяргíня, Гíня, Íна.
Балг. *Вергиния, Вержиния,* руск. *Виргúния*, укр. *Віргíнія.*
[Лац. *Virginia<virgo* – дзяўчына]

ВЯСЛА́ВА (Viaslava) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Вяслáў. Слав.
Вытворныя: Сла́ва, Вéся, Вéська.
Руск. *Весла́ва,* укр. *Весла́ва.*
Імяніны: 22 V, 9 XII.

ВЯСЛА́Ў (Viaslau) -ва, *м.* Вясла́вавіч, Вясла́ваўна. Слав.
Вытворныя: Сла́ва, Вéсек, Вéська.
Польск. *Więcław*, руск. *Весла́в,* укр. *Весла́в,* чэш. *Věslav.*
Імяніны: 22 V, 7 VI, 21 XI, 9 XII.

ВЯСЦІ́ТА (Viastsita) -ы, *ж.* Ст. рэдк.
Вытворныя: Ці́та.
Руск. *Вести́та*, укр. *Вести́та*.
[Лац. *vestita* – адзетая]

ВЯЧАСЛА́ВА (Viachaslava) -ы, *ж.*
І. ж. ад і. Вячасла́ў.
Балг. *Венцеслава, Венцислава, Венка, Вена, Венда, Славка*, літ. *Vaclava, Vaclova, Vacė*, польск. *Wieńczysława*, руск. *Вячесла́ва*, славац., чэш. *Vénceslava*, славен. *Venceslava, Venčeslava, Vena*, укр. *Вячесла́ва*.
Імяніны: 28 IX.

ВЯЧАСЛА́Ў (Viachaslau) -ва, *м.*
Вячасла́вавіч, Вячасла́ваўна.
Вытворныя: Вячык, Сла́ва, Сла́ўка.
Англ. *Venceslaus*, балг. *Венцеслав, Венцислав, Венко, Венци, Венчо, Веньо, Вено, Венецко, Венец, Венечко, Вендо, Слав, Слави, Славчо, Славко*, венг. *Vencel*, іісп., іт. *Venceslao*, літ. *Vaclovas, Vacys, Vacius, Vacis*, ням. *Venzel, Venzeslaus*, польск. *Wieńczysława*, руск. *Вячесла́в*, славац., чэш. *Vénceslav*, славен. *Venceslav, Venčeslav, Vencelj, Veno*, укр. *Вячесла́в*, франц. *Venceslas*.
[Ад асноў са значэннем *вяче, вяще* – больш і *слава*]
Імяніны: 28 IX.

Г

ГАА́ФА (Haafa) -ы, *ж.* Ст. рэдк.
Вытворныя: Га́фа.
Руск. *Гаа́фа*, укр. *Гаа́фа*.

ГАБРО́Н (Habron) -а, *м.* Габро́навіч, Габро́наўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ро́ня, Га́бра.
Руск. *Гобро́н*, укр. *Гобро́н*.

ГАБРЫЭ́ЛЬ (Habryiel) -я, *м.*
Габрыэ́левіч, Габрыэ́леўна.
Вядома з XVI ст. як Габриель (1661), Кгабриель (1541), Габриел (1609), Габрыель (1638), Кгабриел (1632), Габриял (1567), Кабриел (1567).
Вытворныя: Габрыэ́льчык, Габрынэ́ц, Габру́к, Габру́сь, Га́брус, Габры́ла, Габрэ́ль.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Габрэ́ль, Габрыно́віч, Габрынэ́ц, Габру́к, Га́брус, Га́брусь, Габрусёў, Габрусе́віч, Габрусёнак.
Англ., іісп., чэш. *Gabriel*, балг. *Гавриил, Гавриил, Гавраил, Габриел, Гавро, Гаве, Гате, Гаро, Гаго*, венг. *Gábor, Gábriel*, іт. *Gabriele, Gariello, Gabrio*, літ. *Gabrielius, Gabras, Gabrus, Gabrys*, ням. *Gabriel, Gaberl*, польск. *Gabriel*, руск. *Габрие́ль, Гаври́ло, Гавриил, Гаври́ла*, славац. *Gabriel, Gábor*, славен. *Gabrijel*, укр. *Гаври́ло*.
[Ст.-яўр. *gabrī'ēl* – мая сіла – Бог]
Імяніны: 27 II, 16, 24 III, 29 IX, 19 X.

ГАБРЫЭ́ЛЯ (Habryielia) -і, *ж.* І. ж. ад і. Габрыэ́ль.
Англ. *Gabrielle, Gabriela, Gabriella*, балг. *Габриела*, венг., іт. *Gabiella*, іісп., славац., чэш. *Gabriela*, літ. *Gabrielė*, ням. *Gabriele*, польск. *Gabriela*, руск. *Габрие́лла*, славац. *Gabriela, Ela*, славен. *Gabrijela*, франц. *Gabrielle*.
Імяніны: 19, 27 II.

ГАВАА́Ф (Havaaf) -а, *м.* Гаваа́фавіч, Гаваа́фаўна. Ст. рэдк.
Руск. *Гаваа́ф*, укр. *Гаваа́ф*.

ГАВАЙЛ (Havail) -а, *м.* Гаваілавіч, Гаваілаўна.
Вядома з XVI ст. як Кгавел (1567).
Англ. *Gall*, венг. *Gál, Gálos*, іісп. *Galo*, іт. *Gallo*, ням. *Gallus*, польск. *Gaweł*, руск. *Гаваи́л*, славац. *Gál, Galus, Havel*, укр. *Гаваи́л, Га́вел*, франц. *Gal, Gall*, чэш. *Havel*.
[Лац. *Gallus* – чалавек з Галіі]
Імяніны: 16 X.

ГАВАО́Н (Havaon) -а, *м.* Гавао́навіч, Гавао́наўна. Ст. рэдк.
Руск. *Гавао́н*, укр. *Гавао́н*.

ГАВІ́НІЙ (Havini) -я, *м.* Гавіні́евіч, Гавіні́еўна.

Вядома з XVI ст. як Говейно (1540), Говен (1539), Говонь (1541), Говенец (1541), Гонушко (1591).
Вытворныя: Га́ва, Гавіня, Віня.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Гавінюк, Гавіне́нка, Гавінёнак.
Руск. *Гави́ний,* укр. *Гави́нiй,* франц. *Gauvain.*
[Лац. *Gabinius* – жыхар Габіі]

ГАВЯДА́Й (Haviadai) -я, *м.* Гавядаевіч, Гавядаеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Га́ва.
Руск. *Гаведа́й,* укр. *Гаведа́й.*

ГАГА́Н (Hahan) -а, *м.* Гага́навіч, Гага́наўна.
Руск. *Гага́н,* укр. *Гага́н.*

ГАІ́НА (Haina) -ы, *ж.*
Вытворныя: Гаінка, Гаіначка, Га́ня.
Балг. *Гая,* руск. *Гаи́на,* славен. *Gaja,* укр. *Гаїна.*
[Грэч. *gaïa* – зямля]

ГАЙ (Hai) -я, *м.* Га́евіч, Га́еўна.
Вядома з XVI ст. як Гайко (1540).
Вытворныя: Гайко́, Гайчу́к, Га́я.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Гайко́, Гайко́ў, Гайко́віч, Гайчу́к, Гайко́ўскі.
Англ., франц. *Guy,* балг. *Гай,* венг. *Kajusz,* іісп. *Cayo,* іт. *Caio, Gaio,* ням. *Cajus, Kajus,* руск. *Гай,* славен. *Gai,* укр. *Гай.*
[Грэч. *gaiēïos* – народжаны зямлёй]
Імяніны: 24 XII.

ГА́ЛА (Hala) -ы, *ж.* Ст. рэдк.
Вытворныя: Га́лка, Га́лька, Галю́ня, Галю́ся.
Руск. *Га́лла,* укр. *Га́ла.*
[Лац. *Galla* – жыхарка Галіі]

ГАЛАКЦІЁН (Halaktsiyon) -а, *м.* Галакціёнавіч, Галакціёнаўна.
Вытворныя: Галакціёна, Галáня, Га́ша, Га́ла, Лакціён.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Галакціёнаў, Галакцінюк.
Руск. *Галактио́н,* укр. *Галактіо́н.*
[Грэч. *gala, galaktos* – малако]
Імяніны: 12 I, 22 VI, 24 IX, 5 XI.

ГАЛА́ТА (Halata) -ы, *ж.*
Вытворныя: Гала́тка, Га́ла.
Руск. *Гала́та,* укр. *Гала́та.*
[Грэч. *Galatēs* – гал, кельт]

ГАЛАТЭ́Я (Halateya) -і, *ж.*
Вытворныя: Галатэйка, Га́ла, Гала́та.
Іт. *Galatea,* руск. *Галате́я,* укр. *Галате́я.*
[Грэч. *Galateia<gala* – малако]

ГАЛАЦІЯ́Н (Halatsiyan) -а, *м.* Галаціянавіч, Галаціянаўна.
Руск. *Галати́ан,* укр. *Галаті́ан.*
[Грэч. *Galatia* – Галацыя (вобласць у Малой Азіі)]

ГА́ЛІК (Halik) -а, *м.* Га́лікавіч, Га́лікаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гал, Гак.
Руск. *Га́лик,* укр. *Га́лик.*
[Лац. *gallicus* – гальскі]

ГАЛІ́НА (Halina) -ы, *ж.*
Вядома з XVI ст. як Гальшка (1558).
Вытворныя: Га́ля, Га́лька, Галі́нка, Галю́ся, Галю́ня.
Балг. *Галина, Галинка, Гала, Галка, Галя,* польск., славац. *Halina,* руск. *Гали́на,* укр. *Гали́на,* чэш. *Halina.*
[Грэч. *galēnē* – цішыня, спакой, ціхамірнасць]
Імяніны: 10 III, 16 IV.

ГАЛІНДУ́ХА (Halindukha) -і, *ж.* Ст. рэдк.
Вытворныя: Га́ля, Лі́на, Ду́ша, Ду́ха.
Руск. *Голинду́ха,* укр. *Голінду́ха.*

ГАМАЛІЇЛ (Hamaliil) -а, *м.* Гамаліілавіч, Гамаліілаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Га́ма.
Руск. *Гамалии́л,* укр. *Гамаліїл.*
[Ст.-яўр. *gamali´ēl* – Божы заступнік]
Імяніны: 2 I.

ГАНАРА́Т (Hanarat) -а, *м.* Ганара́тавіч, Ганара́таўна.

Англ., ням. *Honoratus*, венг. *Honorátusz*, ісп. *Honorato*, іт. *Onorato*, літ. *Honoratas*, польск. *Honorat*, руск. *Гонора́т*, славац. *Honorát*, укр. *Гонора́т*, франц. *Honnorat, Honorat.*
[Лац. *honoratus* – які карыстаецца павагай]
Імяніны: 16 I, 8 II.

ГАНАРА́ТА (Hanarata) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Ганара́т.
Вытворныя: Ганара́тка, Гано́рка, Гано́ра.
Венг., славац. *Honoráta*, ісп., ням., славен. *Honorata*, літ. *Honorata, Onorata*, польск. *Honorata*, руск. *Гонора́та*, укр. *Гонора́та.*
Імяніны: 16 I, 22 II.

ГАНЕ́СТА (Hanesta) -ы, *ж.*
Руск. *Гоне́ста*, укр. *Гоне́ста.*
[Лац. *honesta* – вартая павагі, паважаная, шаноўная]

ГАНІЯ́НІЯ (Haniyaniya) -і, *ж.* Ст. рэдк.
Руск. *Ганиа́ния*, укр. *Ганіа́нія.*

ГА́ННА (Hanna) -ы, *ж.*
Гл. А́нна.
Вядома з XVI ст. як Ганна (1528), Ганя (1556), Ганица (1556).
Вытворныя: Гану́ля, Гану́ся, Нюра, Нюся, Нюша, Нюшка, Ну́ся, Нэта, Нюня, Нюра́ха, Нюра́ша, Нюра́ся.
[Ст.-яўр. імя *Hannā<h-n-n* – міласць]
Імяніны: 3, 10 II, 26 III, 12, 15 IV, 5, 12 VI, 5, 12, 21, 25 VII, 28 VIII, 9 IX, 2, 4, 22, 29 X, 3, 30 XI, 9 XII.

ГАНО́Р (Hanor) -а, *м.* Гано́равіч, Гано́раўна.
Англ., ням. *Honorius*, венг. *Honóriusz*, ісп. *Honorio*, іт. *Onorio*, літ. *Honorijus*, польск. *Honoriusz, Honory*, руск. *Гоно́р*, славац. *Honor*, славен. *Honorij*, укр. *Гоно́р*, франц. *Honoré*, чэш. *Honor, Honorius.*
[Лац. *honor* – гонар, павага]
Імяніны: 30 IX.

ГАНО́РА (Hanora) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Гано́р.
Славац. *Honóra, Honora.*
Імяніны: 27 II.

ГАНО́РЫЙ (Hanory) -я, *м.* Гано́рыевіч, Гано́рыеўна.
Гл. Гано́р.
Руск. *Гоно́рий*, укр. *Гоно́рій.*
Імяніны: 30 IX.

ГАНО́РЫЯ (Hanoryia) -і, *ж.* І. ж. ад і. Гано́рый.
Англ. *Honor, Honoria*, венг. *Honória*, ням., чэш. *Honoria*, польск. *Honoria, Honoryna.*
Імяніны: 27 II.

ГАНЦІЁЛ (Hantsiyol) -а, *м.* Ганціёлавіч, Ганціёлаўна. Ст. рэдк.
Руск. *Гантиóл*, укр. *Гантіóл.*

ГАПЕ́Й (Hapei) -я, *м.* Гапе́евіч, Гапе́еўна.
Гл. Ага́пій.
Вытворныя: Га́па, Гапе́йка, Гапе́йчык.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Гапе́еў, Гапіе́віч, Гапе́енка, Гапіе́нка.

ГАРА́ЗД (Harazd) -а, *м.* Гара́здавіч, Гара́здаўна. Ст.-руск. рэдк.
Вытворныя: Га́рка.
Балг. *Горазд*, руск. *Гора́зд*, укр. *Гора́зд.*
[Ст.-руск. *гораздый* – адмысловы]
Імяніны: 27 VI.

ГАРА́ЦЫЙ (Haratsy) -я, *м.* Гара́цыевіч, Гара́цыеўна.
Англ. *Horace, Horatio*, венг. *Horác*, ісп. *Horacio*, іт. *Orazio*, літ. *Horacijus*, ням. *Horatius, Horaz*, польск. *Horacjusz, Horacy*, руск. *Гора́ций*, славац. *Horác*, *Horácius*, славен. *Horacij, Horac*, укр. *Гора́цій*, франц. *Horace*, чэш. *Horatius, Horác.*
[Лац. *Horatius* – рымскае радавое імя]
Імяніны: 24 IV.

ГАРА́ЦЫЯ (Haratsyia) -і, *ж.* І. ж. ад і. Гара́цый.

Англ. *Horatia, Horacia,* венг. *Horácia,* польск. *Horacja,* руск. *Гора́ция,* укр. *Гора́ція.*
Імяніны: 24 IV.

ГАРГО́НІЙ (Harhoni) -я, *м.* Гаргóньевіч, Гаргóньеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гаргóня, Га́гня.
Руск. *Горго́ний*, укр. *Горго́ній.*
[Грэч. *Gorgoneios (Gorgelos)* – які належыць Гаргоне]
Імяніны: 9 III, 3 IX.

ГАРГО́НІЯ (Harhoniya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Гаргóній. Ст. рэдк.
Вытворныя: Га́рга, Га́ра, Га́ня, Гóня.
Руск. *Горго́ния*, укр. *Горго́нія.*

ГАРДЗЕ́Й (Hardzei) -я, *м.* Гардзéевіч, Гардзéеўна.
Вядома з XVI ст. як Гордей (1540), Гордеец (1540).
Вытворныя: Гардзéйка, Гардзéйчык, Гардзяю́к, Гардзю́к, Гардзéня.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Гардзéй, Гардзéеў, Гардзіéвіч, Гардзéвіч, Гардзéенка, Гардзіéнка, Гардзяéнка, Гардзіёнак, Гардзéня, Гардзéйка, Гардзéйчык, Гардзяю́к.
Літ. *Gordijus,* руск. *Гордéй,* укр. *Гордíй.*
[Грэч. *Gordias* – імя цара Фрыгіі]
Імяніны: 3 I.

ГАРДЗІЯ́Н (Hardziyan) -а, *м.* Гардзіянавіч, Гардзіянаўна.
Вытворныя: Ян, Гóрдзя.
Англ., чэш. *Gordian,* балг. *Гордан*, венг. *Gordián,* іісп., іт. *Gordiano,* літ. *Gordijonas, Gordijus,* ням. *Gordianus,* польск. *Gordian,* руск. *Гордиáн*, славен. *Gordijan, Gordan,* славац. *Gordan,* укр. *Гордіáн,* франц. *Gordien.*
[Грэч. *Gordion* – старажытная сталіца Фрыгіі]
Імяніны: 10 V.

ГАРТЭ́НЗ (Hartenz) -а, *м.* Гартэ́нзавіч, Гартэ́нзаўна.
Іісп. *Hortensio,* іт. *Ortensio,* польск. *Hortensjusz,* руск. *Гортéнз.*
[Лац. *hortensius* – садовы]
Імяніны: 1 VI.

ГАРТЭ́НЗІЯ (Hartenziya) -і, *ж.*
Вытворныя: Гартэ́нзя.
Англ. *Hortense, Hortensio,* венг., славац. *Hortenzia, Hortense,* іісп., ням. *Hortensia,* іт. *Ortensia,* польск. *Hortensja,* руск. *Гортéнзия,* славен. *Hortenzija,* укр. *Гортéнзія,* франц. *Hortense,* чэш. *Hortenzie, Hortensie.*
[Лац. *hortensia* – садовая]
Імяніны: 24 X.

ГАРЫ́НА (Haryna) -ы, *ж.*
Руск. *Горúна.*

ГАРЫСЛА́ВА (Haryslava) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Гарыслáў.
Польск. *Gorzysława,* руск. *Горислáва*, укр. *Горислáва.*

ГАРЫСЛА́Ў (Haryslau) -ва, *м.* Гарыслáвавіч, Гарыслáваўна. Слав.
Вытворныя: Гарыслáўка, Слáва.
Балг. *Горислав,* польск. *Gorzysław*, руск. *Горислáв*, укр. *Горислáв,* чэш. *Hořěšlav.*
[Ад асноў са значэннем *гарэць* і *слава*]
Імяніны: 9 XI, 14 XII.

ГА́СІЙ (Hasi) -я, *м.* Га́сіевіч, Га́сіеўна. Ст. рэдк.
Руск. *Га́сий,* укр. *Га́сій.*

ГА́СПАР (Haspar) -а, *м.* Га́спаравіч, Га́спараўна.
Англ. *Gaspar, Gasper, Casper,* балг. *Гаспар,* венг. *Gáspár, Gazsó,* іісп. *Gaspar,* іт. *Gaspare,* літ. *Kasparas, Gasparas,* ням. *Kaspar, Caspar,* польск. *Kasper,* руск. *Гаспáр,* славац. *Gašpar,* славен. *Gašper,* укр. *Гаспáр,* франц. *Gaspard,* чэш. *Kašpar.*
Імяніны: 6 I.

ГАСТАМЫ́СЛ (Hastamysl) -а, *м.* Гастамыславіч, Гастамыслаўна. Ст.-руск. рэдк.

Вытворныя: Га́сця.
Балг. *Гостомисъл,* руск. *Гостомы́сл*, укр. *Гостоми́сл.*
[Ад асноў са значэннем *госць* і *мысль*]

ГАЎРЫІ́Л (Hauryil) -а, *м.* Гаўрыі́лавіч, Гаўрыі́лаўна.
Гл. Гаўрыла.
Балг. *Гавраил, Гавриил,* руск. *Гаврии́л,* укр. *Гаври́ло.*

ГАЎРЫ́ЛА (Hauryla) -ы, *м.* Гаўры́лавіч, Гаўры́лаўна.
Вядома з XVI ст. як Гавриил (1652), Гаврило (1528), Гавруло (1552), Гаврело (1552), Аврыло (1660), Гаврыло (1555), Гаврыла (1743), Гаврилко (1541), Гац (1589), Гацко (1540), Гацук (1541), Гацута (1541), Гач (1591), Гаврис (1746), Гаврук (1726).
Вытворныя: Гаўрылік, Гаўры́льчык, Га́ўрык, Гаўру́к, Гаўру́та, Гаўру́сь, Гаўру́ш, Гаўру́шка, Гаўра́ш.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Гаўрылаў, Гаўрыло́віч, Гаўрыле́нка, Гаўрылёнак, Гаўрылік, Гаўры́льчык, Гаўрылю́к, Га́ўрык, Га́ўрыкаў, Гаўрычэ́нка, Гаўру́к, Гаўруко́віч, Гаўручэ́нка, Гаўручо́нак, Гаўру́та, Гаўрусёў, Гаўру́ш, Гаўру́шчанка, Гаўра́ш.
Балг. *Гаврил, Габриел, Гавро, Гаве, Гате, Гаро, Гаго,* руск. *Гаврии́л, Гаври́ла,* укр. *Гаври́ло, Гаври́л, Гаври́ла.*
[Ст.-яўр. *gaḇrī'ēl* – мая сіла – Бог]
Імяніны: 15, 22 I, 10, 11 II, 26 III, 20, 22 IV, 9 V, 12, 13 VII, 27 XI, 30 XII.

ГАФТАРЫІ́М (Haftaryim) -а, *м.* Гафтарыі́мавіч, Гафтарыі́маўна.
Ст. рэдк.
Руск. *Гафтории́м.*

ГА́Я (Haya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Гай.
Англ. *Gaea*, балг. *Гая,* венг. *Gajána,* польск. *Gaja,* руск. *Га́я*, чэш. *Gaja, Gajana.*
[Грэч. *gaia* – зямля]
Імяніны: 24 XII.

ГАЯ́Н (Hayan) -а, *м.* Гая́навіч, Гая́наўна.
Вытворныя: Га́я, Ян.
Руск. *Гая́н,* укр. *Гая́н.*
[Грэч. *gaia* – зямля]

ГАЯ́НІЯ (Hayaniya) -і, *ж.*
Вытворныя: Гая́на, Я́ня, Га́я, Яну́ся, Га́ня, Гану́ля, Гану́ся.
Руск. *Гая́ния,* укр. *Гая́нія.*
[Грэч. *gaia* – зямля]

ГВІДО́Н (Hvidon) -а, *м.* Гвідо́навіч, Гвідо́наўна.
Вытворныя: Гвідо́нка, Гвідо́нчык, До́на.
Англ. *Guy,* венг. *Gujdó, Vid, Vida,* ісп. *Guido,* іт. *Guido, Guittone,* літ. *Gvidonas, Gvidas,* ням. *Guido, Wido,* польск. *Gwido, Gwidon,* руск. *Гвидо́н,* славац. *Kvido,* славен. *Gvidon,* укр. *Гвідо́н,* франц. *Guy, Gui,* чэш. *Kvido, Quido.*
Імяніны: 31 III, 12 IX.

ГЕАРГІ́НА (Hearhina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Гео́ргій.
Вытворныя: Геаргі́нка, Ге́ра, І́на, Гі́на, Іну́ся, Іну́ша.
Англ., ням. *Georgine,* балг. *Георгия, Герга, Гена, Генча, Генка,* руск. *Георги́на*, укр. *Георгі́на.*

ГЕДЫМІ́Н (Hedymin) -а, *м.* Гедымі́навіч, Гедымі́наўна.
Літ. *Giedyminas,* польск. *Giedymin,* руск. *Гедими́н,* укр. *Гедимі́н.*
[Літ. *gė́detis* – саромецца; *gedáuti* – шукаць, распытваць пра кагосьці; *minti* – помніць; *minė́ti* – успамінаць аб кімсьці; *gëta* – ганьба, сорам; *gedė́jimas* – быць у жалобе]
Імяніны: 23 X.

ГЕДЭО́Н (Hedeon) -а, *м.* Гедэо́навіч, Гедэо́наўна.
Вядома з XVI ст. як Гедеон (1589), Кгедеон (1631).
Вытворныя: Ге́да, Гідо́н.
Англ., славен. *Gideon,* венг. *Gedeon, Gedö, Gida,* іт. *Gedeone,* ісп. *Gedeon,* літ. *Gedeonas,* ням. *Gideon, Gedeon, Gidion,* польск. *Gedeon,* руск. *Гедео́н,* славац., чэш. *Gedeon,* укр. *Гедео́н,* франц. *Gédéon.*

[Ст.-яўр. імя *Gid'ōn<gāda'* – хто валодае зброяй]
Імяніны: 28 III, 10 X.

ГЕ́КТАР (Hektar) -а, *м.* Гектаравіч, Гектараўна.
Вытворныя: Гека, Гера.
Англ., іісп., франц. *Hector,* венг., славац., славен., чэш. *Hektor,* іт. *Ettore,* літ. *Hektoras,* ням. *Hector, Hektor*, польск. *Hektor,* руск. *Гектор,* укр. *Гектор.*
[Грэч. *Hectōr<hektōr* – ахоўнік]
Імяніны: 28 VI.

ГЕЛА́СІЙ (Helasi) -я, *м.* Гелáсіевіч, Гелáсіеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гéла, А́ся, Гелáся.
Венг. *Geláz,* іісп., іт. *Gelasio,* літ. *Gelazijus,* ням. *Gelasius,* польск. *Gelazy,* руск. *Гелáсий,* славен. *Gelazij,* укр. *Гелáсій,* франц. *Gélase,* чэш. *Gelasius.*
[Грэч. *gelaō* – смяяцца]
Імяніны: 27 II, 23 XII.

ГЕЛА́СІЯ (Helasiya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Гелáсій. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гéла, А́ся, Гелáська.
Англ. *Gelasia,* руск. *Гелáсия,* укр. *Гелáсія.*

ГЕЛЕ́НА (Helena) -ы, *ж.*
Вядома з XVI ст. як Галéна (1556), Гелéна (1669).
Вытворныя: Гéля, Гелéнка, Гéлька, Гелю́ся.
Англ. *Helen, Helena, Helene,* балг. *Елена,* венг. *Héla, Helén, Heléna,* ням. *Helene, Helena,* польск. *Helena,* руск. *Гелéна,* славац. *Helena, Jlena, Jla,* укр. *Гелéна,* франц. *Héléne,* чэш. *Helena.*
[Грэч. *helenos* – святло]
Імяніны: 2 III, 23 IV, 22 V, 31 VII, 18 VIII.

ГЕ́ЛІЙ (Heli) -я, *м.* Гéліевіч, Гéліеўна.
Вытворныя: Гéля, Гéлька.
Руск. *Гéлий*, укр. *Гéлій.*
[Грэч. *hēlios* – сонца]

ГЕ́ЛІЯ (Heliya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Гéлій.
Вытворныя: Гéля, Гéлька, Лія.
Руск. *Гéлия*, укр. *Гéлія.*

ГЕЛІЯ́НА (Heliyana) -ы, *ж.*
Вытворныя: Геліяна, Яна, Гéля, Лія, Ліяна.
Руск. *Гелиáна,* укр. *Геліáна.*
[Грэч. *hēlios* – сонца]

ГЕМЕ́Л (Hemel) -а, *м.* Гемéлавіч, Гемéлаўна.
Вытворныя: Гéма, Мéлік.
Руск. *Гемéлл,* укр. *Гемéл.*
[Лац. *gemellus* – двайны, які адносіцца да двайнят, блізня]

ГЕМЕ́ЛА (Hemela) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Гемéл.
Вытворныя: Гéма, Мéла.
Руск. *Гемéлла,* укр. *Гемéла.*

ГЕМІ́Н (Hemin) -а, *м.* Гемінавіч, Гемінаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гéма, Міна.
Руск. *Гемúн,* укр. *Гемíн.*
[Лац. *geminus* – які мае адносіны да двайнят]

ГЕМІ́НА (Hemina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Гемíн. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гéма, Міна.
Руск. *Гемúна,* укр. *Гемíна.*

ГЕМІНІЯ́Н (Heminiyan) -а, *м.* Гемініянавіч, Гемініянаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гемíня, Гемíн.
Руск. *Геминиáн,* укр. *Гемініáн.*

ГЕНАВЕ́ФА (Henavefa) -ы, *ж.*
Вытворныя: Гéня, Гунэ́та, Гунэ́фа.
Англ. *Genevieve, Gaynor, Jennifer,* балг. *Геновева, Генка, Гена,* венг. *Genovéva, Gjöngyvér,* іісп., ням. *Genoveva,* іт. *Genoveffa,* літ. *Genovaite,* польск. *Genowefa*, руск. *Геновéфа,* славац. *Genovéva,* славен. *Genovefa*, укр. *Генéфа,* франц. *Geneviéve,* чэш. *Jenovéfa.*
[Гальск. *geno wefa* – белая хваля]
Імяніны: 3 I.

ГЕНА́ДЗІЙ (Henadzi) -я, *м.* Генáдзьевіч, Генáдзьеўна.

Гл. Гена́дзь.
Балг. *Генадий, Генади,* руск. *Генна́дий,* укр. *Генна́дій.*
Імяніны: 23 I, 9 II, 31 VIII, 4 XII.

ГЕНА́ДЗІЯ (Henadziya) -і, *ж.* I. ж. ад і. Гена́дзій.
Балг. *Генадия, Генадина, Генка, Гена,* руск. *Генна́дия,* укр. *Генна́дія.*

ГЕНА́ДЗЬ (Henadz) -я, *м.* Гена́дзевіч, Гена́дзеўна.
Вытворныя: Ге́на, Ге́ня, Генýся, Ге́нусь, Ге́нец, Ге́нка, Ге́нька, Генýля.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Ге́наў, Ге́нін, Ге́ніч, Ге́нкін, Генчано́к, Ге́нькін.
Балг. *Генади, Генадий, Гено, Генчо, Генко,* руск. *Генна́дий,* укр. *Генна́дій.*
[Грэч. *gennadios* – высакародны, прыстойны]
Імяніны: 23 I, 9 II, 31 VIII, 4 XII.

ГЕ́НІЙ (Heni) -я, *м.* Ге́ніявіч, Ге́ніяўна. Нов.
Вытворныя: Ге́ня.
Руск. *Ге́ний,* укр. *Ге́ній.*
[Ужыванне агульнага наз. *геній* у якасці асабовага імя]

ГЕ́НІЯ (Heniya) -і, *ж.* I. ж. ад і. Ге́ній. Нов.
Вытворныя: Ге́ня.
Руск. *Ге́ния,* укр. *Ге́нія.*

ГЕНРЫЕ́ТА (Henryeta) -ы, *ж.*
Вытворныя: Ге́на, Ге́ра, Ге́та, Грэ́та.
Англ. *Henrietta, Harriet, Harriette, Henriette,* венг. *Henrietta, Henriett,* icп. *Enriqueta,* іт. *Enrica, Enrichetta,* літ., славен. *Henrika,* ням. *Henrike, Heinrike, Henriette,* польск. *Henrieta, Henryka,* руск. *Генриéтта,* славац. *Henrieta,* укр. *Генріéта,* франц. *Henriette,* чэш. *Henrieta.*
Імяніны: 16 III.

ГЕ́НРЫКА (Henryka) -і, *ж.* I. ж. ад і. Ге́нрых.

Англ. *Henryetta, Harriet, Harriette, Henriette,* венг. *Henriett, Henrietta, Henriette,* icп. *Enriquetta,* іт. *Enrica, Enrichetta,* літ. *Henrika,* ням. *Henrike, Heinrike, Henriette,* руск. *Ге́нрика,* славац. *Henrieta,* славен. *Henrika,* франц. *Henriette,* чэш. *Jindřiška, Jindra.*

ГЕ́НРЫХ (Henrykh) -а, *м.* Ге́нрыхавіч, Ге́нрыхаўна.
Вядома з XVI ст. як Генрык (1686), Гендрих (1589).
Вытворныя: Ге́ня, Ге́ра.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Ге́нрых, Генрыхо́ўскі.
Англ. *Henry, Harry, Hendrick,* венг. *Henrik,* icп. *Enrique, Enriquez,* іт. *Enrico, Arrigo,* літ. *Enrikas, Henrikas, Henrichas,* ням. *Heinrich, Heinz, Henrik,* польск. *Henryk,* руск. *Ге́нрих,* славац. *Henrich,* славен. *Henrik, Riko,* укр. *Ге́нріх,* франц. *Henri,* чэш. *Jindřich, Hynek.*
[Ст.-герм. *heim* – дом і *ric* – магутнасць, багацце]
Імяніны: 19 I, 19 II, 2 III, 10 VI, 15 VII.

ГЕО́РГІЙ (Heorhi) -я, *м.* Геóргіевіч, Геóргіеўна.
Вядома з XVI ст. як Георгій (1540).
Вытворныя: Ге́ра, Го́ра, Го́ша, Го́га, Алігóр, Жорж, Жóржык.
Англ. *Georg,* балг. *Георги, Георгин, Геро, Гето, Гиньо, Гоце, Гого, Гото, Гошо, Гочо, Жоро, Гюро, Гацо, Герго, Герчо, Гечо, Гешо, Гено, Генчо, Генко, Гичо, Гито, Джоро, Джорго, Джеро, Йорго,* венг. *György, Györe, Györk,* icп. *Jorge,* іт. *Giorgio,* літ. *Jurgis, Juris, Juras, Jauré,* ням. *Georg, Jörgen, Jörg,* польск. *Jerzy,* руск. *Геóргий, Юрий,* славац. *Juraj,* славен. *Jurij, Jur, Jure, Žorž,* укр. *Геóргій,* франц. *Georges,* чэш. *Jiří.*
[Грэч. *geōrgos* – земляроб]
Імяніны: 8, 22 I, 4, 11, 21 II, 11 III, 4, 7, 19, 23 IV, 13, 16, 26 V, 14, 27 VI, 18, 24 VIII, 3, 10, 26 XI.

ГЀРА (Hera) -ы, *ж.*
Вытворныя: Ге́рка.

Руск. *Ге́ра,* укр. *Ге́ра.*
[Грэч. *Hera* – багіня шлюбу]

ГЕРАДЗІЯ́ДА (Heradziyada) -ы, *ж.*
Вытворныя: Ге́ра, Іда.
Руск. *Геродиа́да,* укр. *Геродіа́да.*

ГЕРАДО́Т (Heradot) -а, *м.* Герадо́тавіч, Герадо́таўна.
Вытворныя: Ге́ра.
Руск. *Геродо́т,* укр. *Геродо́т.*

ГЕРАІ́ДА (Heraida) -ы, *ж.*
Руск. *Гераи́да.*

ГЕРАІ́СА (Heraisa) -ы, *ж.*
Руск. *Гераи́са.*

ГЕРА́КЛ (Herakl) -а, *м.* Гера́клавіч, Гера́клаўна.
Вытворныя: Ге́ра.
Англ. *Heraclius,* венг. *Heraklios, Heráklasz,* ісп. *Heraclio,* іт. *Eracle, Eraclio,* літ. *Heraklis, Iraklijus,* ням. *Herakles, Heraklius,* польск. *Heracles, Heracliusz,* руск. *Гера́кл, Ира́клий,* славен. *Herakl, Herakle, Heraklij,* укр. *Гера́кл, Ира́клій, Гера́клій,* франц. *Héraclés, Héraclien, Héraclius,* чэш. *Heraklés, Heraklios.*
[Грэч. *Hēraklēs: Hēra* – Гера (імя багіні) і *kleos* – слава]
Імяніны: 17 V.

ГЕРАКЛІ́Д (Heraklid) -а, *м.* Геракліда́віч, Геракліда́ўна. Ст. рэдк.
Гл. Гера́кл.
Руск. *Гераклиа́д,* укр. *Геракліа́д.*
[Грэч. *Hēracleides* – сын ці нашчадак Геракла]
Імяніны: 17 V.

ГЕРА́КЛІЙ (Herakli) -я, *м.* Гера́кліевіч, Гера́кліеўна.
Гл. Гера́кл.
Руск. *Гера́клий,* укр. *Гера́клій.*

ГЕРА́КЛІЯ (Herakliya) -і, *ж.* І. ж. ад і. Гера́кл, Гера́клій.
Руск. *Гера́клия,* укр. *Гера́клія.*

ГЕРА́ЛЬД (Herald) -а, *м.* Гера́льдавіч, Гера́льдаўна.
Вытворныя: Гара́льд, Ге́ра.
Англ., славац., славен. *Gerald,* венг. *Gerold, Girót,* ісп. *Giraldo,* іт. *Geraldo,* літ. *Geraldas,* ням. *Gerald, Gerold,* польск. *Gerald,* руск. *Гера́льд,* укр. *Гера́льд,* франц. *Gérald, Géraud,* чэш. *Gerald, Geraldus.*
[Ст.-герм. *gar* – кап'ё і *waldan* – валодаць, панаваць, кіраваць]
Імяніны: 13 X, 5 XI.

ГЕРАНІ́М (Heranim) -а, *м.* Геранімавіч, Геранімаўна.
Вядома з XVI ст. як Героним (1590).
Вытворныя: Гіру́сь, Ге́ра, Ге́ня.
Англ. *Jerome, Jerrome, Gerome,* венг. *Jeromos,* ісп. *Jeronimo,* іт. *Gerolamo, Geronimo, Girolamo,* літ. *Jeronimas, Joronymas, Jaras,* ням. *Hieronymus,* польск. *Hieronim,* руск. *Геро́ним,* славац. *Hieroným,* славен. *Hieronim, Jerko, Jeronim,* укр. *Геро́ним,* франц. *Jérôme,* чэш. *Jeroným.*
[Грэч. *hierós* – святы і *ónyma* – імя]
Імяніны: 8 II, 3 III, 20 VII, 30 IX.

ГЕРА́РД (Herard) -а, *м.* Гера́рдавіч, Гера́рдаўна.
Вытворныя: Ге́ра, Гера́р.
Англ. *Garrett, Garrard, Garret, Garrit, Garard,* венг. *Gellért,* ісп. *Gerardo,* іт. *Gerardo, Gherardo,* літ. *Gerardas, Gerhardas,* ням. *Gerhard, Gerhardt, Gerhart,* польск. *Gerard,* руск. *Гера́рд,* славен. *Gerard,* славац. *Gerhard,* укр. *Гера́рд,* франц. *Gérard,* чэш. *Gerard, Gerhard.*
[Ст.-герм. *gar* – кап'ё і *waldan* – валодаць, кіраваць, панаваць]
Імяніны: 23 IV, 24 IX, 16 X.

ГЕРА́РДА (Herarda) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Гера́рд.
Вытворныя: Ге́ра, Гера́ра.
Англ. *Gerardine,* венг. *Gellertké,* іт. *Geraldina,* ням. *Gerharde, Gerta,* польск. *Gerarda,* чэш. *Gerarda, Gerardina, Gerharda.*
Імяніны: 23 IV, 24 IX, 16 X.

ГЕРА́СІМ (Herasim) -а, *м.* Гера́сімавіч, Гера́сімаўна.
Вядома з XVI ст. як Герасим (1577), Гарасим (1539), Арасим (1728), Гарась (1599), Гараска (1746).
Вытворныя: Гара́сім, Гра́сім, Гара́сь, Гара́ська, Гара́с, Гераськ, Гера́ска, Гера́сік, Герасімчу́к, Гера́сімчык.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Герасіму́к, Гера́сімчык, Герасімчу́к, Гера́сік, Гера́ска, Герасю́к, Ге́ша, Гара́ся.
Балг. *Герасим, Герас, Гераско, Герчо, Расим,* венг. *Geraszim, Gerázim,* ісп., іт. *Gerasimo,* літ. *Gerasimus,* ням. *Gerasimus,* руск. *Гера́сим, Гара́сим,* славац., славен. *Gerasim,* укр. *Гарасим, Гарасим,* чэш. *Gerasim.*
[Грэч. *gerasmios* – паважаны]
Імяніны: 24, 29 I, 4 III, 1 V.

ГЕ́РБЕРТ (Herbert) -а, *м.* Ге́рбертавіч, Ге́рбертаўна.
Вытворныя: Берт, Ге́ра, Бе́рцік.
Англ. *Herbert, Harbert, Hebert,* венг. *Herbert, Geréb,* ісп. *Herberto, Heriberto,* іт. *Erberto, Eriberto,* літ. *Herbertas,* ням. *Herbert, Heribert,* польск. *Herbert,* руск. *Ге́рберт,* славац. *Herbert, Heribert,* славен. *Herbert,* укр. *Ге́рберт,* франц. *Herbert, Aribert,* чэш. *Herbert.*
[Герм. *Herbert: heer* – войска і *berht* – бліскучы]
Імяніны: 16 III.

ГЕРВА́СІЙ (Hervasi) -я, *м.* Гервась-евіч, Гервасьеўна.
Вядома з XVI ст. як Гервас.
Вытворныя: Гервас, Ге́ра, Ва́ся, Ге́ся, Гра́ўша.
Англ. *Gervase, Jarvis, Jervis,* венг. *Gyárfás, Járfás,* ісп. *Gervasio,* іт. *Gervasio, Garvaso,* літ. *Gervazijus, Gervazas,* ням. *Gervasius, Gervas,* польск. *Gerwazy,* руск. *Гервасий,* славац. *Gerváz,* славен. *Gervazij,* укр. *Гервасій,* франц. *Gervais,* чэш. *Gevasius.*
[Ст.-герм. *gar* – кап'ё і *vas* – слуга ці з грэч. *geras, geraos* – лепшая частка здабычы]
Імяніны: 19 VI.

ГЕРКУЛЕ́С (Herkules) -а, *м.* Геркулесавіч, Геркулесаўна.
Вытворныя: Ге́ра.
Англ., ісп. *Hercules,* венг. *Herkules,* іт. *Ercole,* ням. *Herkules,* руск. *Геркуле́с,* славац. *Herkules,* славен. *Herkul,* укр. *Геркуле́с,* чэш. *Herkules,* франц. *Hercule.*
[Лац. *Hercules* з грэч. *Hēraklēs*]
Імяніны: 1 III, 5 IX.

ГЕРМАГЕ́Н (Hermahen) -а, *м.* Гермагенавіч, Гермагенаўна.
Вядома з XVI ст. як Гермоген (1582).
Вытворныя: Ге́рма, Ге́ра, Ге́на.
Руск. *Гермоге́н,* укр. *Гермоге́н.*
[Грэч. *Hermēs* – Гермес і *genos* – нашчадак]
Імяніны: 17 II, 12 V, 1 IX, 5 X, 10 XII.

ГЕРМАКРА́Т (Hermakrat) -а, *м.* Гермакратавіч, Гермакратаўна. Рэдк.
Вытворныя: Ге́ра.
Руск. *Гермокра́т,* укр. *Гермокра́т.*
[Грэч. *Hermokratēs*: *Hermēs* – Гермес і *kratos* – сіла, моц]

ГЕ́РМАН (Herman) -а, *м.* Ге́рманавіч, Ге́рманаўна.
Вядома з XVI ст. як Герман (1528), Гарман (1528), Гармон (1597).
Вытворныя: Ге́ра, Ге́рма, Ге́ма, Ге́ня, Геру́ся.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Ге́рман, Германо́віч, Германчу́к, Герме́ль.
Англ. *Herman, Harman, Harmon,* балг. *Герман,* венг. *Herman, Armand, Armin,* ісп. *Armando,* іт. *Ermanno, Armando, Arminio,* літ. *Hermanas, Ermanas, Ermonas, Ermas,* ням. *Hermann, Herrman,* польск. *Herman,* руск. *Ге́рман,* славац., славен. *Herman,* укр. *Ге́рман,* франц. *Armand,* чэш. *Heřman, Herman.*
[Лац. *germanus* – родны, кроўны]
Імяніны: 7 IV, 24 IX.

ГЕРМА́НА (Hermana) -ы, *ж.* І. ж ад і. Ге́рман.

Вытворныя: Ге́рма, Гермýся, Мýся, Ге́ра, Ге́ма, Ге́на.
Англ. *Germaine,* іт., іспан., ням. *Germana,* руск. *Герма́на,* укр. *Герма́на,* франц. *Germaine.*

ГЕРМА́НІК (Hermanik) -а, *м.* Герма́нікавіч, Герма́нікаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ге́ра, Нік, Ге́рман.
Руск. *Герма́ник,* укр. *Герма́нік.*
[Лац. *Germanicus*<*hermanus* – германец]

ГЕРМЕ́С (Hermes) -а, *м.* Гермéсавіч, Гермéсаўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ге́ра, Ге́рма.
Руск. *Гермéс,* укр. *Гермéс.*
[Грэч. *Hermēs* – Гермес, бог жывёлагадоўлі, гандлю і вястун багоў]

ГЕРМІ́НА (Hermina) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Ге́рман.
Англ., ням. *Hermine,* венг., славац., славен., чэш. *Hermina,* польск. *Hermina, Herminia,* руск. *Гермúна, Ермúна,* укр. *Гермúна.*
Імяніны: 24 XII.

ГЕРМІ́НІЙ (Hermini) -я, *м.* Гермíньевіч, Гермíньеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Ге́рма, Ге́ра, Мíна.
Польск. *Hermiiusz,* руск. *Гермúний,* укр. *Гермúній.*
[Грэч. *Hermēs* – Гермес]

ГЕРО́Н (Heron) -а, *м.* Геро́навіч, Геро́наўна.
Вытворныя: Ге́ра, Ро́ня.
Руск. *Геро́н,* укр. *Геро́н.*
[Грэч. *gerōn* – стары]

ГЕРО́НЦІЙ (Herontsi) -я, *м.* Геро́нцьевіч, Геро́нцьеўна.
Вытворныя: Ге́ра, Ро́нцісь, Ро́ня, Геро́нця.
Руск. *Геро́нтий,* укр. *Геро́нтій,* франц. *Gerons.*
[Грэч. *gerōn* – стары]
Імяніны: 1 IV, 28 VIII.

ГЕРТРУДА[1] (Hertruda) -ы, *ж.*
Вытворныя: Ге́ра, Ге́рка, Ге́та, Ге́рта.
Англ., франц. *Gertrude,* венг. *Gertrúd,* іт. *Gertrude, Geltrude,* іспан. *Gertrudis,* літ. *Gertrūda, Gendruta,* ням. *Gertrud, Gertrude, Trude,* польск. *Gertruda,* руск. *Гертрýда,* славен. *Gertruda,* славац. *Gertrúda,* укр. *Гертрýда,* чэш. *Gertruda, Gerda.*
[Ст.-герм. *ger, gar* – кап'ё і *trûs* – сіла, моц]
Імяніны: 17 III, 16 XI.

ГЕРТРУДА[2] (Hertruda) -ы, *ж.* Нов.
Вытворныя: Ге́рта, Ге́ра, Ге́та, Гертýня, Гертýся.
[Ад пачатковых частак слоў словазлучэння *Герой Труда*]

ГЕФЕ́СТ (Hefest) -а, *м.* Гефéставіч, Гефéстаўна. Рэдк.
Руск. *Гефéст,* укр. *Гефéст.*

ГЕ́Я (Heya) -і, *ж.*
Вытворныя: Ге́йка.
Руск. *Ге́я,* укр. *Ге́я.*
[Грэч. *gaia (gē)* – зямля. У антычнай міфалогіі Гея – багіня зямлі]

ГІГА́НЦІЙ (Hihantsi) -я, *м.* Гігáнцьевіч, Гігáнцьеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гíга, Гáнцік.
Руск. *Гигáнтий,* укр. *Гигáнтій.*
[Грэч. *gigas* – гіганцкі]

ГІЛА́Р (Hilar) -а, *м.* Гілáравіч, Гілáраўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Гíла, Гíля, Íля, Лáра.
Руск. *Гилáр,* укр. *Гілáр.*
[Грэч. *hilaros* – вясёлы, радасны]
Імяніны: 14 I, 13 II, 16 III, 5 V, 21 X.

ГІЛА́РЫЙ (Hilary) -я, *м.* Гілáрыевіч, Гілáрыеўна.
Гл. Гілáр.
Руск. *Гилáрий, Илáрий,* укр. *Гілáрій, Илáрій.*

ГІЛЯ́РЫЙ (Hiliary) -я, *м.* Гілярыевіч, Гілярыеўна.
Вытворныя: Гíля, Íля, Гіляркa.
Англ. *Hilary, Hillary, Hillery,* венг. *Hiláriusz,* іспан. *Hilario,* іт. *Ilario,* літ. *Hilarijus, Ilarijus, Ilaras,* ням. *Hilarius, Hilar,* польск. *Hilary,* руск. *Гилáрий,*

Ила́рий, славац. *Hilár,* славен. *Hilarij,* укр. *Гіла́рій, Ила́рій,* франц. *Hilaire,* чэш. *Hilar, Hilarius.*
[Грэч. *hilaros* – вясёлы, радасны]
Імяніны: 14 I, 13 II, 16 III, 5 V, 21 X.

ГІЛЯ́РЫЯ (Hiliaryia) -і, *ж.* І. ж. ад і. Гіля́рый.
Вытворныя: Гіля́рка, Гіля.
Англ. *Hilaria, Hilary,* венг., славац. *Hilária,* ісп. *Hilaria,* іт. *Ilaria,* літ. *Hilarija,* польск. *Hilaria,* руск. *Ила́рия,* укр. *Ила́рія.*
Імяніны: 12 VIII.

ГІЯЦЫ́НТ (Hiyatsynt) -а, *м.* Гіяцы́нтавіч, Гіяцы́нтаўна.
Вытворныя: Гія, Яцы́на.
Англ. *Hyacinth,* венг. *Jácint,* ісп. *Jacinto,* іт. *Giacinto,* літ. *Hiacintas, Jacintas,* ням. *Hyazinth, Hyacinth, Hyacinthus,* польск. *Hiacynt, Jacek, Jacenty,* руск. *Гиаци́нт,* славац. *Hyacint,* славен. *Hijacint,* укр. *Гіаци́нт,* франц. *Hyacinthe,* чэш. *Hyacint, Jacek.*
[Грэч. *Hyakinthos*]
Імяніны: 10 II, 16 III, 3, 17 VII, 11 IX.

ГІЯЦЫ́НТА (Hiyatsynta) -ы, *ж.* І. ж. ад і. Гіяцы́нт.
Англ. *Hyacintha, Jacintha, Jacinthe,* венг. *Jácinta,* ісп. *Jacinta,* іт. *Giacinta,* літ. *Hiacinta, Jacinta,* руск. *Гиаци́нта,* славен. *Hijacinta,* славац., чэш. *Hyacinta,* укр. *Гіаци́нта.*
Імяніны: 30 I.

ГЛАРЫЁЗА (Hlaryioza) -ы, *ж.* Ст. рэдк.
Руск. *Глориóза,* укр. *Глоріóза.*
[Лац. *gloriosa* – слаўная]

ГЛАФІ́РА (Hlafira) -ы, *ж.*
Вытворныя: Гла́ша, Гла́фа, Фі́ра, Ла́ра.
Руск. *Глафи́ра,* укр. *Глафі́ра.*
[Грэч. *głaphyra* – вытанчаная, статная]
Імяніны: 26 IV.

ГЛЕБ (Hleb) -а, *м.* Глебавіч, Глебаўна.
Вядома з XVI ст. як Глеб (1528), Глебко (1540).
Вытворныя: Глебка, Глебік.
Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Глеб, Глебаў, Глябо́віч, Глебка, Глябко́, Глебік, Глебус.
Руск. *Глеб,* укр. *Гліб.*
[Ст.-герм. *Gudleifr<gud* – Бог і *leifr* – нашчадак супастаўляецца са ст.-герм. *Gottlieb* – нашчадак Бога]
Імяніны: 2 V, 20 VI, 24 VII, 5 IX.

ГЛІКЕ́РЫЙ (Hlikery) -я, *м.* Глікер'евіч, Глікер'еўна.
Вытворныя: Гліка, Ліка.
Руск. *Гликерий,* укр. *Гликерій.*
[Грэч. *glykeros* – салодкі]
Імяніны: 28 XII.

ГЛІКЕ́РЫЯ (Hlikeryia) -і, *ж.* І. ж., ад і. Глікерый.
Вядома з XVI ст. як Лукеря (1577), Луцея (1567).
Вытворныя: Глікера, Ліцэ́ра, Луцэ́ся, Лукута, Ліка, Лера, Глера, Лікера, Луша, Луня, Кера.
Балг. *Гликерия,* іт. *Glicera,* руск. *Гликерия,* укр. *Гликерія, Ликерія, Ликера,* чэш. *Glikerie.*

ГЛІКІ́Я (Hlikiya) -і, *ж.* Ст. рэдк.
Руск. *Гликия,* укр. *Гліки́я.*

ГЛО́РЫЯ (Hloryia) -і, *ж.*
Вытворныя: Глора, Лора.
Руск. *Глория,* укр. *Глорія.*
[Лац. *glorija* – слава]

ГО́РГІЙ (Horhi) -я, *м.* Го́ргіевіч, Го́ргіеўна. Ст. рэдк.
Вытворныя: Го́ра, Го́рга.
Руск. *Горгий,* укр. *Го́ргій.*
[Грэч. *gorgos* – страшны, грозны]

ГО́РДЗІЙ (Hordzi) -я, *м.* Го́рдзіевіч, Го́рдзіеўна.
